

КНІЖНЫЯ СУСТРЭЧЫ Ў МІРСКІМ ЗАМКУ 5

ЗДАРОЎЕ ДАРАЖЭЙ ЗА ДАЧНЫЯ СОТКІ 6

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

24 ЧЭРВЕНЯ 2020 г. СЕРАДА

№ 121 (29235)

ЗВЯЗДА

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Я ніколі не згаджуся, калі меншасць ці большасць паводзіць сябе агрэсіўна»

Пра што гаварыў Прэзідэнт у Брэсце, дзе ён сустракаўся не толькі з актывам вобласці, але і з прадстаўнікамі апазіцыі

Пачатак бягучага тыдня ў рабочым графіку Аляксандра Лукашэнкі выдаўся вельмі насычаны і ў прамым сэнсе амаль бяссонны. Раніцу 22 чэрвеня кіраўнік краіны сустрэў у мемарыяльным комплексе «Брэсцкая крэпасць-герой», дзе ўдзельнічаў у цырымоніі ўскладання вянка да Вечнага агню. Пасля ён азнаёміўся з умовамі жыцця, баявымі магчымасцямі 38-й Брэсцкай асобнай гвардзейскай дэсантна-штурмавой брыгады. Завяршыўся працоўны панядзелак Прэзідэнта размовай з актывам Брэсцкай вобласці і прадстаўнікамі мясцовай апазіцыі.

Лагістыка, дарогі, інвестыцыі

На сустрэчы з актывам вобласці закраналіся самыя надзённыя пытанні з жыцця рэгіёна — у прыватнасці, развіццё турызму і інфраструктуры. На думку кіраўніка дзяржавы, турызм у заходніх рэгіёнах Беларусі (Гродне, Брэсце) літаральна рванёў угару з увядзеннем «бязвізу». Як заўважыў Аляксандр Лукашэнка, спадабалася гэта не ўсім суседзям. «Але мы адкрытая краіна, нам гэта выгадна, і гэтую практыку мы будзем працягваць», — дадаў ён. Да тысячагадовага юбілею Брэст атрымаў Заходні абход — новы пуцеправод, які дазволіў перанакіраваць транспартныя патокі і разгрузіць вуліцы горада. Па словах Прэзідэнта, не толькі Брэст, але і іншыя гарады вобласці, такія як Баранавічы, Кобрын, Пінск, сур'ёзна падцягнуліся і змяніліся за апошнія гады.

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, «за 25 гадоў нашага суверэннага развіцця мы зрабілі значны крок наперад у прамысловасці, сельскай гаспадарцы, тэхналогіях, сацыяльнай сферы». Асабліва гэта відаць на прыкладзе Брэстчыны. «Мы падтрымлівалі прадпрыемствы як прыватнай, так і дзяржаўнай формы ўласнасці. ***Бізнес, які сумленна працуе на дабро нашай краіны і народа, мы заўсёды будзем падтрымліваць***, — сказаў Прэзідэнт. — Тут на нас могуць разлічваць. ***Гэта мая цвёрдая пазіцыя. Я яе не змяняў і змяняць не буду***. А калі нейкае жуллё (прытым нахабна) парушае закон, спрабуе жыць за кошт чужога, прыватнага ці дзяржаўнага, і гэтаму ёсць неабвержныя доказы, у нас з ім абыходзяцца, як і ва ўсіх цывілізаваных краінах, — згодна з законам».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што не будзе паслабленняў і ў барацьбе з карупцыяй, назваўшы яе іржой, якая раз'ядае ўсё і з'яўляецца прамым шляхам да «майдану». «Наш народ не сцерпіць карупцыйных праяў, з'яўлення алігархату ў нашай краіне», — упэўнены лідар дзяржавы.

Гаворачы пра развіццё рэгіёна ў мінулыя гады, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што за часы суверэнітэту ў вобласці ў тры разы выраслa вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі. Попыт на яе будзе толькі расці, і як бы мы ні развівалі віртуальныя тэхналогіі, сялянская праца заўсёды будзе ў цане. «Мы змянілі сялянскую працу: так званыя аграгарадкі, стварэнне новай высокапрадукцыйнай тэхнікі для сельскай гаспадаркі, што запатрабавала ўзбуйнення сельскагаспадарчых прадпрыемстваў. ***Мы стварылі сыравінныя зоны, магчыма, не да канца іх дапрацавалі. Думаю, што ў наступны год-два гэта зробім»***, — падзяліўся планамі лідар краіны.

Па словах Прэзідэнта, у рэгіёна ёсць не толькі добрыя перспектывы, але і шэраг праблем, якія ляжаць на паверхні і патрабуюць вырашэння ў самыя кароткія тэрміны. Першае і галоўнае — эканоміка рэальнага сектара. «Зразумела, калі свет закрыўся, нам было вельмі цяжка ў гэтай сітуацыі працаваць, — падкрэсліў ён. — ***Вельмі важна першымі ўскочыць туды, дзе мы можам прадаць сваю прадукцыю»***.

Яшчэ адна праблема ў тым, што рост прадукцыйнасці працы пакуль адстае ад росту заработнай платы. «Мы павінны забяспечыць эфектыўную работу прадпрыемстваў, стварацъ умовы для жыцця і працы людзей тут, каб працоўная міграцыя насельніцтва за межы вобласці, асабліва ў сумежныя краіны, калі і была, то нязначнай», — рэзюмаваў кіраўнік дзяржавы.

Брэсцкая вобласць, на думку Аляксандра Лукашэнкі, не прапанавала маштабных інвестыцыйных праектаў, якія могуць стаць новымі пунктамі росту. Ён прывёў у прыклад Гродзеншчыну, дзе было прынята рашэнне аб будаўніцтве камбіната на 1,5 мільярда долараў, што падвоіць вытворчасць азотных угнаенняў. Падобны знакавы праект на пяцігодку Прэзідэнт хоча ўбачыць у кожнай вобласці, у тым ліку і Брэсцкай.

СТАР. 2

ГАЛУБЫ ВЫ МАЕ...

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Супрацоўнік чыгуначнай станцыі «Баранавічы-Цэнтральныя» Валерый МАЦКО цалкам мог бы стаць героем сучаснай версіі фільма «Каханне і галубы». Як толькі Валерый Антонавіч, пасвіствaючы, выходзіць на вуліцу каля будынка станцыі, да яго імкліва злятаюцца шызыя, белыя, стракатыя птушкі. А ўжо калі з сабой ёсць ласунак — насенне сланечніка, — галубы бясстрашна садзяцца на руку — утрох, учатырох.

«Я працую тут даўно і ўжо гадоў пяць іх кармлю», — ласкава ўсміхаецца мужчына, гледзячы на сваіх гадаванцаў.

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу:

«Апошнім часам нас спрабуюць пераканаць у тым, што буйныя прамысловыя прадпрыемствы — гэта мінулае нашай эканомікі, але жыццё паказала іншае. Ва ўмовах жорсткай сусветнай канкурэнцыі, якая склалася асабліва падчас эпідэміі, якраз выстаялі тыя краіны, якія маюць добра развітую індустрыю».

Жыллё

АРЭНДЫ ШМАТ НЕ БЫВАЕ

Першаснай павінна быць работа, а жыллё — дзесьці побач з ёй

Менавіта так лічыць начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі Мінбудархітэктуры Аляксандр АЎРАМЕНКА. А ў нас чамусьці ўсё трошкі наадварот: людзі, бы вяроўкамі, прывязаныя да сваёй кватэры (дома), а таму паблізу шукаюць сабе любую работу, часам і нецікавую або не па спецыяльнасці... Так не павінна быць. Каб вырашыць гэтае складанае пытанне, у свой час і ствараўся фонд камерцыйнага жылля.

Ёсць 3,5 %, а трэба мінімум 15 %

Тэма будаўніцтва арэнднага жылля сёння вельмі актуальная, лічыць спікер. «Усяго ў Беларусі эксплуатуецца 261,198 мільёна квадратных метраў жылля. З іх 8,915 мільёна «квадратаў» складае арэнднае — 3,5 % ад усяго жылога фонду краіны. Гэтага даволі мала, такое жыллё павінна будавацца ў большых аб'ёмах, — лічыць Аляксандр Аўраменка. — Летась у Беларусі было пабудавана амаль 140 тысяч квадратных метраў арэнднага жылля, сёлета плануецца яшчэ 135 тысяч, але патрэба значна большая».

Ідэальны варыянт — калі нароўні з дзяржавай такое жыллё будуць узводзіць для сваіх супрацоўнікаў прадпрыемствы і арганізацыі, у тым ліку прыватнай формы ўласнасці.

— Трэба, каб не чалавек шукаў работу вакол свайго жылля, у ваколіцах, а каб жыллё было забяспечана вакол тых работ, дзе чалавек можа прыкласці свае сілы, веды і ўменні, — удакладняе сваю думку эксперт.

Цяпер спецыялісты міністэрства працуюць над удасканаленнем нарматыўна-прававой базы.

Асноўны пасыл гэтай работы ў тым, што арганізацыі, асабліва прыватнай формы ўласнасці, павінны больш ахвотна займацца такім будаўніцтвам, але ім трэба стварыць адпаведныя ўмовы, — адзначыў Аляксандр Аўраменка.

СТАР. 2

ЧВЭРЦЬ СТАГОДДЗЯ 25

ЗАГАД НА АБНАЎЛЕННЕ

Сённяшні выпуск рубрыкі «Чвэрць стагоддзя», якая расказвае пра самыя значныя праекты ў жыцці і развіцці незалежнай краіны Беларусь, мы прысвяцілі тэме мадэрнізацыі нашай арміі. Гэта тым важней у сучасным неспакойным свеце, і крылаты выраз аднаго палкаводца пра тое, што народ, які не жадае карміць сваю армію, будзе ўрэшце карміць чужую, і сёння застаецца актуальны.

СТАР. 3

Фота БелТА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

САЗ паведаміла пра абмежаванне меддапамогі ў многіх краінах

Базавыя паслугі ў сферы аховы здароўя аказваліся з-за пандэміі COVID-19 не ў поўным аб'ёме, паведаміў гендырэктар Сусветнай арганізацыі аховы здароўя (САЗ) Тэдрас Адханом Гебрэесус. «САЗ нядаўна правяла апытанне з мэтай ацэнкі ўплыву пандэміі на ўзровень неабходных медыцынскіх паслуг. З 82 краін, адкуль мы атрымалі адказы, больш за палову абмежавалі альбо прыпынілі прынамсі адну форму аказання паслуг, напрыклад, амбулаторнае або стацыянарнае лячэнне», — заявіў кіраўнік САЗ. У больш чым палове дзяржаў перасталі дапамагаць хворым з псіхічнымі захворваннямі, спынілі дародавае назіранне і дыягностыку раку. Акрамя таго, было прыпынена аказанне медыцынскіх паслуг хворым дзецям.

У ЗША прыпынена выдача рабочых віз

Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп падпісаў выканаўчы ўказ аб прыпыненні да канца 2020 года выдачы некаторых відаў часовых рабочых віз. Пры гэтым не выключаецца, што дзеянне забароны працягнецца і налета. Візы, выдача якіх прыпыняецца, датычацца самых розных прафесій — ад сезонных работнікаў сельскай гаспадаркі да высакаўзроўневых спецыялістаў у навуцы і тэхніцы. Шэраг арганізацый і дзеячаў раскрытыкавалі рашэнне прэзідэнта. Сярод іх — кіраўніцтва кампаніі Twitter і гендырэктар SpaceX Ілан Маск. Яны, апроч іншага, ставяць пад сумнеў заявы Трампа аб тым, што прыпыненне выдачы віз адкрые для амерыканцаў звыш паўмільёна рабочых месцаў.

Хадж сёлета забараняць для замежных паломнікаў

Улады Саудаўскай Аравіі праз пандэмію каранавіруса дазволілі ўдзельнічаць у хаджы — паломніцтве да святых месцаў ісламу ў Мецы і Медыне — толькі абмежаванай колькасці паломнікаў, якія ўжо знаходзяцца на тэрыторыі каралеўства. Пра гэта міністэрства па справах хаджу і умры паведаміла ў Twitter. Сёлета хадж прыпадае на 28 ліпеня — 2 жніўня. Як вядома, летась у глабальным паломніцтве ўзялі ўдзел амаль 2,5 мільёна чалавек, з іх 1,85 мільёна — мусульмане, якія прыехалі з-за мяжы. Між тым днямі ўлады Саудаўскай Аравіі адмянілі камендацкую гадзіну на ўсёй тэрыторыі краіны. У той жа час да асаблівага распараджэння пад забаронай застаюцца здзяйсненне умры (малое паломніцтва ў Меку. — **«Зв.»**), а таксама міжнароднае паветранае, наземнае і марское перамяшчэнні.

Пыл з Сахары праляцеў 5000 кіламетраў і накрыў Карыбы

Спадарожнікі Нацыянальнага аэракасмічнага агенцтва ЗША (NASA) зафіксавалі воблака пылу ў Паўночнай Афрыцы яшчэ 13 чэрвеня, а да канца мінулага тыдня шлейф распаўсюдзіўся ў заходнім напрамку амаль на пяць тысяч кіламетраў, дасягнуўшы Карыбскіх астравоў, і працягвае рух у бок Мексікі і ЗША. На астравах адзначаюць значнае зніжэнне бачнасці, моцна пагоршылася якасць паветра, а ў некаторых месцах прайшлі «брудныя» дажджы. Гэтая штогадовая з'ява звычайна не прыводзіць да такіх наступстваў. 25-26 чэрвеня на Карыбскіх астравах чакаецца другая хваля пылу з Сахары. Далей яна будзе перамяшчацца з паўднёвага ўсходу ЗША праз штаты ўсходняга ўзбярэжжа і можа дасягнуць нават Вашынгтона.

КАРАТКА

- Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваўся з рабочым візітам у Расію.
- **Беларусь у ліпені закупіць 1,58 мільёна тон расійскай нафты.**
- У Беларусі 25 чэрвеня пачнецца цэнтралізаванае тэсціраванне.
- **Цырымонія ўручэння «Залатога глобуса» пройдзе ў лютым 2021 года.**
- У Беларусі выпусцілі першую ў свеце манету з вяртлявай чарацянкай.

Спажывец

ЯГАДЫ, ЦЭНЫ, МАСКІ

На брэсцкіх рынках у продажы з'явіліся першыя чарніцы, суніцы, лісічкі, але лідарамі продажу застаюцца маладая бульба і клубніцы.

У аўторак зранку ў абласным цэнтры ліў дождж, але на рынку ў мікрараёне Кавалёва (далёка не цэнтральным) гандляроў летняй вітаміннай прадукцыяй было шмат. Да прылаўкаў актыўна падвозілі скрыні з ягадамі, агароднінай. Некаторыя прадаўцы дароў лесу прыносілі свой тавар у вёдрах або кашах.

Лідарамі продажу, відаць, можна назваць маладую бульбу і клубніцы. Усмешлівая гандлярка з Кобрынскага раёна нахвальвала сваю бульбу сорту Уладар. Ёй дапамагаў муж — раскладваў бульбачку па велічыні клубняў: у першым латку — буйная, адборная, у другім — сярэдняя, у трэцім — дробная. Адсюль і цэны: 2,20 рубля, 2 рублі і 1,20. Відаць, што клубні толькі нядаўна выкапаны з зямлі. А то перад выхаднымі бачыла на рынку маладую бульбу, якая паспела памякчэць і крыху зморшчыцца. Зрэшты, не выключана, што так на маладыя далікатныя клубні дзейнічае спёка.

СТАР. 5

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

«Я ніколі не згаджуся, калі меншасць ці большасць паводзіць сябе агрэсіўна»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Сёння Брэст, Баранавічы — галоўныя пункты новага шоўкавага шляху, а гэта вялікія грошы і патокі грузаў з Кітая ў Еўропу, цэнтры прыцягнення для стварэння інфармацыйнай інфраструктуры. «Сумесна з урадам вам неадкладна трэба заняцца мадэрнізацыяй рухомага саставу і транспартнай інфраструктуры вобласці, — даў даручэнне лідар краіны. — Кітай з Еўропай гандлююць праз нас. І мы гэтым павінны скарыстацца».

Задача ад кіраўніка краіны рэгіёну — аднавіць дарогі, у тым ліку трасу Брэст — Гомель.

«Мы замахнуліся на будаўніцтва такой жа дарогі, якую мы пабудавалі на Гродна, Магілёў, Гомель, — чатырохпалоснай. Нам трэба паўднёвы кірунак забраць, перахапіць усе патокі з Кітая, Казахстана праз поўдзень, Растоўскую вобласць, Валгаград і не цягнуць іх на трасу Брэст — Масква, а пусціць па поўдні і выйсці на Брэст, ці побач з Брэстам адкрыць яшчэ новы кантрольна-прапускны пункт і павялічыць нашу лагістыку», — акрэсліў Прэзідэнт планы на будучыню.

Першы ў гісторыі мясцовы рэферэндум

Прэзідэнт паабяцаў правесці ў Брэсце рэферэндум наконт будучыні акумулятарнага завода. Пра гэта ён заявіў пасля нарады ў аблвыканкаме, размаўляючы з жыхарамі абласнога цэнтра, якія выступаюць супраць будаўніцтва акумулятарнага завода, і прадстаўнікамі мясцовай апазіцыі.

«***Мы прынялі рашэнне. Няхай вырашаць жыхары. Па акумулятарным як вырашыце, так і будзе. Я вам гэта гарантую і абяцаю***. Я займу нейтральную пазіцыю, арганізую рэферэндум. А вы — толькі без гвалту, без шуму. Вызначым месца, будзеце заклікаць людзей, дэбатаваць. Як на выбарах», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы паабяцаў асабіста пабываць на акумулятарным заводзе. Ён таксама запэўніў, што ў яго абсалютна нейтральная пазіцыя. З аднаго боку, завод патрэбен, ёсць рынкі збыту. Больш за тое, гэта імпартазамяшчэнне — адзін з асноўных кірункаў работы ў будучай пяцігодцы. З другога боку, калі людзі вырашаць, што завод не патрэбны ці яго трэба некуды перанесці, то, паводле слоў Прэзідэнта, гэта «не катастрофа». «Хутчэй за ўсё, мы знойдзем дзесьці месца, дзе можна пабудаваць, яшчэ экалагічна праштудзіраваць гэты завод, падчысціць, паглядзець, што за абсталяванне», — адзначыў ён.

Прэзідэнт паабяцаў, што рэферэндум пройдзе абсалютна адкрыта і празрыста, па тэрмінах яго лепш правесці пасля прэзідэнцкіх выбараў.

Аляксандр Лукашэнка не абышоў увагай і перадвыбарную тэму. Ён адзначыў, што сённяшнюю дэмакратыю вывучаў не па кніжках і чуе меркаванні ўсіх колаў грамадзян, нават невялікіх груп. ***«Ёсць большасць — яна ў асноўным заўсёды вырашае, але ёсць і меншасць, да якой трэба прыслухоўвацца. Таму я не лічу, што вамі трэба грэбаваць. І я тут не паддобрываюся пад вас і не стараюся вам ліслівіць. Я лічу, што любы чалавек мае права выказваць сваю пазіцыю. Але я ніколі не згаджуся, калі меншасць ці большасць паводзіць сябе агрэсіўна»***, — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Наконт будучых выбараў кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: ён не пойдзе ні на якую фальсіфікацыю. Ён у курсе ўсяго таго, што адбываецца на палітычным полі краіны, і таго, што пішуць пра яго, як часам называюць. У сувязі з гэтым ён заклікаў не пераходзіць на абразы. «Не трэба нас тузаць, абражаць, — папярэдзіў ён. — Я пакуль яшчэ дзеючы Прэзідэнт. Ні ў адной краіне не дазволена абражаць людзей. Я ж нікога з вас не абразіў асабіста. А калі хочаце рознага роду жуллё абараніць, вы абараняйце, але толькі не са мной. ***Карупцыянерам у краіне рабіць няма чаго»***, — падкрэсліў ён. У прыватнасці, беларускі лідар згадаў пра расследаванне, якое праводзіцца з нагоды вываду з краіны значных грашовых сум, адмывання грошай. «Мецэнат, карціны прывёз дзяржаве. А на паверку што выявілася? Гэта іх карціны. А чаму мы іх цяпер вымушаны былі прыхапіць? А таму, што яны пачалі канцы ў ваду хаваць, пачалі вывозіць грошы, карціны. Калі мы ў банк пайшлі, ведаеце, што знайшлі ў ячэйках? Грошы — гэта не галоўнае. Мы знайшлі флэшкі, дыскі і мора інфармацыі. І гэтага баяцца іх гаспадары», — расказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт заклікаў усіх аб'яднацца на карысць інтарэсаў краіны і пабудовы шчаслівай будучыні: «У вас ёсць дзеці. І ў мяне. Я хачу, каб яны жылі ў свабоднай, незалежнай краіне».

Марыя ДАДАЛКА.

АРЭНДЫ ШМАТ НЕ БЫВАЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Пакуль заўчасна казаць, што гэта будуць за ўмовы. Магчыма, яны закрануць выдзяленне ўчасткаў зямлі або стварэнне інфраструктуры. Ці нешта трэба дапоўніць у Падатковым кодэксе, перагледзець падаткі. Не выключана, што ўнясём нейкія дапаўненні ва ўжо існуючыя нарматыўныя акты. Альбо гэта выйдзе нейкім самастойным дакументам, — расказаў начальнік упраўлення.

У першую чаргу — для патрэбных работнікаў

Арэндным жыллём карыстаюцца тыя, хто знаходзіцца на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, і тыя, каму па рабоце неабходна даваць такое жыллё.

Выдзяляюцца арэндныя кватэры па заяўным прынцыпе. Інфармацыю пра наяўныя свабодныя метры размяшчаюць выканкамы, а зацікаўленыя падаюць заявы. Пры гэтым суіскальнікі не павінны мець ва ўласнасці жылля ў гэтым населеным пункце.

У цэлым жа квоты дзяржаўнага арэнднага жылля, прызначанага для тых ці іншых катэгорый грамадзян, вызначаны Жыллёвым кодэксам: 60 працэнтаў выдзяляецца для тых, хто стаіць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў па месцы жыхарства, 30 працэнтаў даецца першачарговым катэгорыям, а 10 працэнтаў прызначана для вайскоўцаў. Канкрэтна пад пэўную арганізацыю жыллё не даецца.

Напісаць заяву на выдзяленне арэнднага жылля могуць усе ахвотныя, але пры размеркаванні выканкамамі кватэр перавага аддаецца грамадзянам, якія маюць першачарговае права на арэндаванае жыллё, пасля — тым, якія знаходзяцца ў агульнай чарзе маючых патрэбу на паляпшэнне жыллёвых умоў.

Згодна з пастановай Савета Міністраў ад 12 чэрвеня 2020 года № 339, устаноўлены катэгорыі бюджэтнікаў з першачарговым правам на атрыманне арэнднага жылля. У гэты спіс уваходзяць трэнеры-выкладчыкі па спорце спецыялізаваных вучэбна-спартыўных устаноў, сярэдніх школ-вучылішчаў алімпійскага рэзерву, трэнеры нацыянальных камандаў па розных відах спорту. На арэндаванае жыллё ў першачарговым парадку таксама будуць прэтэндаваць медыцынскія, педагагічныя, творчыя работнікі, работнікі культуры, якія заключылі кантракт тэрмінам на пяць гадоў, у выпадку пацвярджэння патрэбы ў спецыялісце кіраўнікамі структурных падраздзяленняў аблвыканкамаў, Мінскага гарвыканкама, гарадскіх, раённых выканкамаў, мясцовых адміністрацый раёнаў. Парадак пацвярджэння патрэбы ў спецыялістах вызначаецца аблвыканкамамі і Мінгарвыканкамам.

Арэнда выгадная ўсім

Нават у абсалютна новых дамах Мінска арэнда двухпакаёвай кватэры абыходзіцца сям'і ў 300 рублёў у месяц, плюс камунальныя плацяжы. У цэлым летам выходзіць 350 рублёў, зімой — да 400 рублёў. Гэта як мінімум у паўтара раза танней, чым здымаць кватэру па камерцыйнай цане ў прыватнікаў. Ёсць у такога жылля і дадатковыя перавагі: пры выкананні элементарных умоў пражывання ў доме сям'ю ніхто нікуды не выганяць. А ў прыватніка ніхто не застрахаваны.

Паводле звестак спецыялісты, колькасць арэнднага жылля павялічваецца ў першую чаргу за кошт новага будаўніцтва.

— Мы гатовыя будаваць больш, але цяпер усё вызначаецца аб'ёмам выдзеленага фінансавання з рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў. Думаю, не варта зацыклівацца толькі на дзяржаўных грошах. Будучыня — за прадпрыемствамі і арганізацыямі, якія стануць будаваць арэнднае жыллё для сваіх работнікаў, замацоўваючы такім чынам кадры, і прыватным капіталам. Цяпер мы працуем над прапановамі, якія дазволяць паскорыць гэты працэс, рыхтуем нарматыўны дакумент, каб удасканаліць механізм будаўніцтва такіх дамоў, — падзяліўся Аляксандр Аўраменка. Ён падкрэсліў: гэта выгадна, укладзенае акупіцца сто разоў. Па сутнасці, такое жыллё само сябе аднаўляе. Чым больш яго пабудавана, тым больш сродкаў ад арэнды назапашваецца на спецыяльных рахунках — яны выдаткоўваюцца як на тэхнічнае абслугоўванне дамоў, так і на будаўніцтва новых.

У Мінску за арэндную плату былі пабудаваны тры дамы на вуліцы Выгоцкага. Акрамя таго, фонд арэнднага жылля могуць папоўніць пустуючыя будынкі, якія ўжо існуюць: іх трэба толькі прывесці ў парадак і добраўпарадкаваць. Як прыклад — рэканструкцыя былога Дома быту пад шматкватэрнае жыллё ў горадзе Высокае Камянецкага раёна: і будынак выратавалі, і людзям ёсць дзе жыць.

Уся справа ў грошах

Ці плануецца пераглядаць план на год па будаўніцтве арэнднага жылля? Па словах Аляксандра Аўраменкі, зрабіць гэта дастаткова складана.

— Гэта ж датычыцца бюджэтнага фінансавання, і перагледзець планы вельмі складана, на гэта трэба знайсці грошы. Калі ў дзяржавы будуць дадатковыя крыніцы фінансавання менавіта з бюджэту, наша галіна гатовая пабудаваць больш арэнднага жылля, — падкрэсліў прадстаўнік міністэрства.

А пакуль больш за ўсё арэндных дамоў маюць намер узвесці ў Мінскай вобласці — 30,5 тысячы квадратных метраў. У Брэсцкай — 25,4 тысячы «квадратаў», у Гомельскай — 16,3 тысячы, у Магілёўскай — 14,84 тысячы, у Гродзенскай — 13,88 тысячы, у Віцебскай — 11,78 тысяч і ў Мінску — 22,3 тысячы квадратных метраў.

Што датычыцца магчымасці прыватызацыі арэнднага жылля ў будучыні, то заканадаўствам падобнае пакуль не прадугледжана.

Мінск можа павялічыць будаўніцтва «арэнды» ў разы

Галоўны інжынер акцыянернага таварыства «МАПІД» Аляксей Маслаў адзначае, што сёння гэтая арганізацыя вырабляе домакамплекты буйнапанэльнага домабудавання, якія дазваляюць узводзіць каля 270 тысяч квадратных метраў жылля ў год. Але гэта не мяжа. Калі б у вытворцы былі рэальныя буйныя заяўкі на выраб камплектаў масавых серый, то МАПІД павялічыў бы сваю магутнасць да 400 тысяч квадратных метраў у год.

У прыватнасці, на думку спецыяліста, магчыма будаўніцтва бюджэтных дзевяціпавярховых дамоў 464-й серыі. Дамы гэтай серыі дазваляюць дасягаць нізкага сабекошту квадратнага метра жылля — ад 1050 да 1400 рублёў. Галоўнае — знайсці першапачатковы стартавы капітал.

Сяргей КУРКАЧ.

Тэхналогіі будучыні

Сусветная нанарэвалюцыя. Як не адстаць ад лідараў?

«З нанатэхналогіямі звязваюць пяты і шосты тэхналагічны ўклады: гэта перадавы край навукі, які можа вывесці нас на новы ўзровень», — такую думку выказаў на сустрэчы з журналістамі першы намеснік старшыні Прэзідыума НАН Беларусі, акадэмік Сяргей ЧЫЖЫК.

— Нанаіндустрыю як асобную галіну разглядаць праблематычна, — падкрэсліў ён. — «Нана» пранікае практычна ва ўсе сферы: медыцыну, біятэхналогіі, сучасную электроніку, вытворчасць пакрыццяў і матэрыялаў... Магутнасці, якімі валодаюць сучасныя мабільныя тэлефоны, сталі магчымыя толькі дзякуючы таму, што мы выходзім на нанамаштаб. Лідары ў гэтай галіне заяўляюць, што тэхналагічны працэс складае ўжо менш за 10 нанаметраў. Таму тыя прадпрыемствы і вытворцы, якія хочуць заставацца канкурэнтаздольнымі, вядуць цяпер пошук у нанамаштабе. Гэта цяжкадаступны ўзровень: для таго каб на яго выйсці, патрабуюцца спецыяльна падрыхтаваныя кадры і складанае абсталяванне. Каранавірус, дарэчы, — таксама нанаб'ект памерам арыенціровачна 100 нанаметраў, таму пасля ПЦР-аналізу можна толькі ўскосна вызначыць яго прысутнасць у клетцы.

Новыя тэхналогіі патрабуюць вялікіх укладанняў, але яны даюць адчувальны вынік. У 2013 годзе ў Беларусі была створана Рэспубліканская асацыяцыя нанаіндустрыі, якая аб'яднала каля 30 арганізацый рознай формы ўласнасці (акадэмічныя структуры, ВНУ, прамысловыя прадпрыемствы) у сем кластараў. Сярод іх, напрыклад, кластар прэцызійнай нанапамернай апрацоўкі. Па словах Сяргея Чыжыка, у гэтым кірунку атрымалася дасягнуць унікальных вынікаў па стварэнні звышгладкіх паверхняў, запатрабаваных у першую чаргу ў оптыцы. Узровень гладкасці — атамарны, перапады няроўнасці паверхні складаюць менш чым адзін нанаметр.

У сваю чаргу, Цэнтр нанадыягностыкі і сканіруючых зондавых тэхналогій арыентуецца на стварэнне абсталявання, якое дазваляе праводзіць дыягностыку ў нанамаштабе. Яго выкарыстоўваюць у электроніцы, у матэрыялазнаўчых лабараторыях, прамысловасці, а таксама ў медыцыне. З дапамогай такіх прыбораў можна вызначыць паталогіі на клетачным узроўні. Увогуле большасць захворванняў з'яўляецца наступствамі збояў у арганізме на малекулярным узроўні — гэта значыць, на тым узроўні, на якім дзейнічаюць нанатэхналогіі.

Акрамя таго, у нашай краіне сфарміраваўся кірунак па распрацоўцы нанавугляродных матэрыялаў. У Цэнтры НАН Беларусі па матэрыялазнаўстве знойдзены новыя недарагія шляхі па атрыманні звышлёгкага нанаструктурнага графенападобнага матэрыялу. Нанаструктурныя матэрыялы ўжываюцца таксама ў вытворчасці палімераў, фарбаў, для павышэння трываласці бетону. Утварыўся і кластар па магнітных нанаматэрыялах і пакрыццях. Дзякуючы яму ствараюць унікальныя электрамагнітныя ахоўныя экраны.

— Пры пераходзе з мікра- на нанаўзровень многія матэрыялы могуць кардынальна змяняць свае ўласцівасці — напрыклад, тыя, што не праводзілі электрычнасць, становяцца амаль ідэальнымі праваднікамі. Назіраецца і шэраг іншых цікавых эфектаў, — расказвае **выканаўчы дырэктар Рэспубліканскай асацыяцыі нанаіндустрыі, вядучы навуковы супрацоўнік Навукова-практычнага цэнтра НАН па матэрыялазнаўстве Аляксей ТРУХАНАЎ**. — Эфектыўнасць нанаструктурных матэрыялаў вызначаецца іх шматфункцыянальнасцю, магчымасцю рэалізацыі ўнікальнага спалучэння ўласцівасцяў, недасягальнага для традыцыйных матэрыялаў.

Цікавасць да вынікаў фундаментальных і прыкладных даследаванняў у галіне нанатэхналогій і нанаматэрыялаў з боку прамысловасці і бізнесу пастаянна павялічваецца. Гэта абумоўлена магчымасцю распрацоўкі і ўкаранення матэрыялаў з якасна новымі ўласцівасцямі, развіццём новых эканамічна эфектыўных тэхналагічных прыёмаў і метадаў, укараненнем сучасных прыбораў і метадаў даследавання нанаматэрыялаў і нанаструктур.

Мікраэлектроніка апошнія дзесяцігоддзі вылучалася высокімі тэмпамі развіцця, абумоўленымі здольнасцю пастаянна скарачаць мінімальны памер кампанентаў інтэгральных мікрасхем.

Увогуле сусветны рынак сёння больш чым на 40 працэнтаў складаецца з прадукцыі трох асноўных тэхналогій XXI стагоддзя. Гэта IT-тэхналогіі, біятэхналогіі і нанатэхналогіі. І іх доля будзе павялічвацца. Дарэчы, тыя гіганты, якія не змаглі хутка перабудавацца, саступілі свае пазіцыі на рынку — напрыклад, такія кампаніі, як Siemens і Nokia. Аб'ём рынку нанаматэрыялаў і нанапаслуг на Захадзе вымяраецца сотнямі мільярдаў долараў.

— Многія выступаюць за больш глыбокае пранікненне нанатэхналогій у рэальны сектар, але гэта рызыкоўны варыянт, — лічыць Сяргей Чыжык. — Нанатэхналогіі ў масавай вытворчасці могуць аказацца неэфектыўнымі, бо чым буйнейшая вытворчасць, тым складаней наладзіць кантроль. Большы поспех у гэтай галіне можна чакаць ад малых прадпрыемстваў.

Пры гэтым у краіне ёсць прыклады паспяховага прымянення нанатэхналогій і на буйных прадпрыемствах: «Планар», «Пеленг», «Інтэграл»...

Многія краіны ўключыліся сёння ў гонку па распрацоўцы новых матэрыялаў, каб не ўпусціць глабальнага тэхналагічнага лідарства. Адным з наймагутнейшых драйвераў апошніх дзесяцігоддзяў было імкненне атрымаць максімальны эфект пры мінімальных затратах рэсурсаў. І калі пры выкарыстанні традыцыйных матэрыялаў людзі дасягнулі пэўных меж, то нанамадыфікаваныя матэрыялы дазваляюць зрабіць якасны скачок у пошуках адказаў на глабальныя выклікі, якія паўстаюць перад чалавецтвам. А безумоўнымі лідарамі ў сферы нанатэхналогій з'яўляюцца ЗША, Японія, краіны Еўрасаюза. Актыўна пашыраюць даследаванні і распрацоўкі ў гэтым кірунку Кітай, Паўднёвая Карэя, Расія, Індыя, Бразілія.

Найважнейшай задачай у наступныя 10—20 гадоў, на думку большасці экспертаў, стане распрацоўка матэрыялаў для медыцыны. Чакаецца, што за гэтыя гады будуць створаны нанаматэрыялы для мэтавай дастаўкі лекаў, «разумных» імплантатаў і штучных органаў, для інтэрфейсу электронных прылад, якія ўжыўляюцца ў чалавечыя органы.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Спажывец

ПАКУПКІ НА КАНАПЕ

Эксперты адзначаюць, што вірус COVID-19 змяніў стаўленне людзей да інтэрнэт-гандлю

Раней штогадовы рост рынку электроннай камерцыі складаў у сярэднім 10 %. Аднак пандэмія змяніла пакупніцкія звычкі беларусаў і сфарміравала новую мадэль спажывання і шопінгу. Паводле прагнозаў сусветных экспертаў, падчас другой хвалі актыўнасці віруса, магчымай бягучай восенню, людзі працягнуць захоўваць дыстанцыяванне ў знешніх кантактах і такім чынам падвояць сваю прысутнасць у анлайн-крамах.

Красавік—май — першы скачок, пачатак восені — другі

Сышоўшы ў рэжым самаізаляцыі, мы сталі траціць у інтэрнэце значна больш. Адбыўся значны рост анлайн-плацяжоў у наступных сегментах: прадукты харчавання, медыцынскія тавары, бытавая тэхніка і электроніка, тавары для жывёл, дзіцячыя тавары. Сёння з упэўненасцю можна сказаць, што эпідэміялагічная сітуацыя сцірае існуючыя бар'еры — як псіхалагічныя, такія як боязь кібермахлярства, так і заканадаўчага плана — лекі зараз можна купіць анлайн.

— Цяпер рынак e-commerce трохі запаволіў свой бурны рост, — каментуе сітуацыю **дырэктар правайдара электронных плацяжоў на рынку Беларусі кампаніі АСІСТ Вячаслаў СЕНІН**. — У канцы сакавіка бягучага года мы назіралі ўсплёск так званых стрэсавых пакупак кліентаў. Гэта былі доўгія пералікі найменняў прадуктаў: макарона, крупы, кансервы, дзіцячыя тавары, а таксама антысептыкі і іншыя ахоўныя сродкі. Да канца красавіка адбыўся скачок сезонных тавараў. Папулярныя сталі тавары для дачы, інструменты, а таксама адзенне, абутак і іншае. Бліжэй да восені надыдзе новы сезон — падрыхтоўкі дзяцей да школы, і мы ўбачым рост у іншых сегментах. Але важным момантам бягучага года на рынку электроннага гандлю застаецца трэнд «перацякання» ў мабільны канал і павелічэнне аб'ёму абаротаў у анлайн-гандлі.

Разам з рынкам электроннага гандлю працягнецца і рост якасці плацежных тэхналогій. Міжнародныя плацежныя сістэмы стымулююць банкі прасоўваць бескантактавыя плацяжы. Адбываецца паэтапная замена плацежных картак на новыя з функцыяй бескантакту, з'яўляюцца «фанавыя» навінкі ў выглядзе плацежных кольцаў, бранзалетаў і іншых гаджэтаў. Таксама падчас пандэміі павялічыліся ліміты бескантактавых плацяжоў для рынку нашай краіны. Напрыклад, Visa павысіла такі ліміт да 120 рублёў (было 80).

Хуткасць дастаўкі і бяспека

— Нашы партнёры адзначаюць, што галоўнай прычынай росту анлайн-пакупак, акрамя бягучай сітуацыі і шырэйшага асартыменту тавараў, чым у афлайне, лічыцца павышаны ўзровень бяспекі правядзення электронных плацяжоў, — адзначыў Вячаслаў Сенін.

Ён перакананы, што канкурэнцыя на анлайн-рынку будзе ўзрастаць і галоўны спосаб перасягнуць канкурэнта — павысіць хуткасць і якасць выканання заказаў. Міжнародныя буйныя гульцы інвестуюць ва ўласныя сістэмы дастаўкі — напрыклад, гэта робіць Amazon. Прадаўцы пачнуць спаборнічаць па хуткасці і мінімізацыі кошту дастаўкі. Мабільныя прылады — ключавая платформа для лічбавага кантэнту, і гэтая тэндэнцыя з часам толькі ўзмоцніцца.

Сяргей КУРКАЧ.

СТАРОНКІ ПРАЎДЫ І БОЛЮ

У Дзень усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» прадставіла новыя кнігі серыі «Беларусь. Трагедыя і праўда памяці».

Праект пачынаўся ў 2018 годзе як асобная кніга да 75-годдзя хатынскай трагедыі, але ў выніку выліўся ў цэлую кніжную серыю, прысвечаную самым страшным старонкам Вялікай Айчыннай вайны. Афармленыя ў выглядзе «чорных квадратаў памяці», кнігі на рускай, беларускай і англійскай мовах расказваюць шырокай аўдыторыі пра злачынствы нямецка-фашысцкіх захопнікаў на тэрыторыі Беларусі: Хатынь, Трасцянец, Навагрудак, Масюкоўшчына, Азарычы і многія іншыя месцы масавага знішчэння людзей, ваеннапалонных, мірных жыхароў, партызан і падпольшчыкаў...

За кожным выданнем — архіўныя дакументы і занатаваныя ўспаміны відавочцаў тых страшных падзей, грунтоўная даследчая работа мясцовых краязнаўцаў, прафесійных вучоных-гісторыкаў, пошукавых атрадаў, якая часта доўжылася не адзін год і нават дзесяцігоддзе. Так, аўтар новай кнігі «Асіповічы» краязнаўца і настаўніца гісторыі Неаніла Цыганок добрых 15 гадоў разам са сваімі вучнямі займалася пошукавай работай, па драбніцах збіраючы звесткі, — дзякуючы гэтай працы 176 імён загінулых сёлета абнародаваныя ўпершыню.

Нават праз 79 гадоў з пачатку Вялікай Айчыннай вайны вельмі важна захоўваць праз памяць сувязь пакаленняў і шырока папулярызаваць гісторыю, каб ніхто не меў магчымасці яе перапісаць на новы лад, падкрэсліваюць удзельнікі выдавецкага праекта — навукоўцы, даследчыкі, прадстаўнікі музеяў і мемарыяльных комплексаў. Загадчыца аддзела навукова-даследчай работы Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Наталля Яцкевіч расказала, у прыватнасці, што практычна кожны тыдзень музей атрымлівае ад беларусаў, жыхароў постсавецкіх і замежных краін запыты пра лагер ваеннапалонных у Масюкоўшчыне: людзі не губляюць надзеі ўстанавіць месца гібелі і ўшанаваць памяць сваіх дзядоў і прадзедаў. Нядаўна, напрыклад, грамадзянін Італіі даслаў электронныя копіі лістоў свайго дзеда са штэмпелем «Шталаг 352» — і цяпер мы ведаем яшчэ адно прозвішча з прыблізна пяці тысяч італьянскіх ваеннапалонных, якія загінулі ў канцлагеры Масюкоўшчына.

«Гісторыю трэба помніць і захоўваць, каб жыць і развівацца далей. Таму, безумоўна, серыя будзе працягвацца», — зазначае **кіраўнік выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» Вольга ВАНІНА**. У цяперашні час працягваецца збор матэрыялаў па Магілёўскай і Віцебскай абласцях, па Брэсцкім гета, па дзіцячым канцлагеры «Чырвоны Бераг» — на жаль, «чорных квадратаў памяці» і нявыяўленых пахаванняў воінаў і ахвяр Вялікай Айчыннай вайны на беларускай зямлі яшчэ вельмі многа...

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Вышэйшая школа

ЯКАСЦЬ АДУКАЦЫІ БУДЗЕ КАНТРАЛЯВАЦЬ НАЦЫЯНАЛЬНАЕ АГЕНЦТВА

23 чэрвеня ў Міністэрстве адукацыі ў анлайн-фармаце адбылося афіцыйнае падпісанне пагаднення аб пазыцы (праект «Мадэрнізацыя вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь») паміж Рэспублікай Беларусь і Міжнародным банкам рэканструкцыі і развіцця.

У адпаведнасці з падпісаным дакументам Міжнародны банк рэканструкцыі і развіцця ў 2020—2025 гадах выдасць Беларусі пазыку ў памеры 100 мільёнаў еўра на мадэрнізацыю вышэйшай адукацыі, у тым ліку на стварэнне і мадэрнізацыю сучаснага вучэбна-адукацыйнага асяроддзя ў ВНУ, укараненне інавацыйных падыходаў, тэхналогій навучання і выкладання, а таксама пашырэнне пераўтварэнняў у сферы кіравання і забеспячэння якасці адукацыі.

У рамках рэалізацыі Пагаднення аб пазыцы плануецца стварыць на базе Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта міждысцыплінарны вучэбна-даследчы цэнтр, які ўключыць у сябе 37 навучальных лабараторый, дзевяць цэнтраў калектыўнага карыстання, мадэрнізаваць больш за 60 вучэбна-даследчых лабараторый. Таксама запланаваны капітальны рамонт асобных навучальных карпусоў ВНУ са стварэннем неабходнай інфраструктуры і павышэннем энергаэфектыўнасці будынкаў. Названыя мерапрыемствы будуць рэалізаваны ў 18 установах вышэйшай адукацыі (у тым ліку ў дзесяці рэгіянальных), падпарадкаваных міністэрствам адукацыі, аховы здароўя, транспарту і камунікацый, сельскай гаспадаркі і харчавання.

Акрамя таго, у рамках праекта будзе створана Нацыянальнае агенцтва па забеспячэнні якасці адукацыі (на ўсіх узроўнях адукацыі).

Рэалізацыя праекта «Мадэрнізацыя вышэйшай адукацыі» дасць магчымасць сфарміраваць у беларускіх універсітэтах інтэграванае інавацыйнае асяроддзе, якое забяспечыць падрыхтоўку і выпуск канкурэнтаздольных спецыялістаў, арганізаваць навучанне па шэрагу перспектыўных спецыяльнасцяў (такіх як біяінжынерыя, нанахімія, сінтэтычная і сістэмная біялогія, фармакалогія, біяінфарматыка, біямеханіка, феноміка, геноміка і іншыя), забяспечыць развіццё сеткавай формы ўзаемадзеяння, будзе спрыяць павышэнню экспарту адукацыйных паслуг. Акрамя таго, створаная інфраструктура дазволіць забяспечыць падтрымку рэалізацыі канцэпцыі «Універсітэт 3.0», паспрыяе міждысцыплінарным навукаёмістым распрацоўкам, іх камерцыялізацыі, стварэнню на базе ўстаноў вышэйшай адукацыі інавацыйных кампаній і іх рэгістрацыі ў якасці рэзідэнтаў тэхнапаркаў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ПЛАЦДАРМ
Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь
Выпуск № 6 (105)

З гісторыі пытання

Чужой зямлі нам не трэба, але і сваёй ні пядзі не аддадзім

У снежні мінулага года Прэзідэнт Беларусі падпісаў Канцэпцыю будаўніцтва і развіцця Узброеных Сіл да 2030 года і новы План абароны Беларусі. На пасяджэнні Савета бяспекі, дзе абмяркоўваліся гэтыя дакументы, кіраўнік дзяржавы паўтарыў непахісныя прынцыпы беларускай палітыкі: наша армія нікому не пагражае, яна з'яўляецца інструментам недапушчэння вайны, а ў выпадку агрэсіі павінна быць здольна не толькі яе адбіць, але і нанесці непрымальную шкоду ворагу. Асноўнае прызначэнне Узброеных Сіл — абарона суверэнітэту, незалежнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці краіны.

Тады Галоўнакамандуючы казаў пра тое, што «чатыры разы мы ўжо перабудоўвалі свае Узброеныя Сілы, перш за ўсё армію, у сувязі з тым, якія падзеі адбываюцца на планеце ў гэтай сферы».

«Мы разумеем, якія ідуць войны зараз, мы дакладна разумеем, якія могуць быць войны ў будучыні, і, зыходзячы з нашага патэнцыялу, нашых магчымасцяў, пад гэта перабудоўваем свае Узброеныя Сілы, — заяўляў ён. — Гэта на мікраўзроўні, як кажуць эканамісты. Надышоў час паглядзець і на самым высокім узроўні, што нам неабходна зрабіць, як стратэгічна спланаваць абарону нашай дзяржавы».

Днямі, наведваючы Брэст, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў Беларусі створана і эфектыўна функцыянуе сістэма забеспячэння нацыянальнай бяспекі, аснову якой складаюць Узброеныя Сілы.

«Наша армія аснашчаецца сучаснымі ўзбраеннямі. У войскі паступаюць новыя ўзоры авіяцыйнай, ракетна-артылерыйскай, бранятанкавай, аўтамабільнай тэхнікі і сродкі сувязі. Мной пастаўлена жалезабетонная задача: калі мы хочам абараніцца, мы павінны асноўныя боепрыпасы і зброю вырабляць самі», — сказаў ён пры наведванні **38-й Брэсцкай асобнай гвардзейскай дэсантна-штурмавой брыгады.**

Згодна **з Канцэпцыяй будаўніцтва і развіцця Узброеных Сіл да 2030** года выдаткі на абарону краіны павысяцца цягам найбліжэйшых дзесяці гадоў да 1,5 % ад ВУП. Ухіл у ёй робіцца на захаванне існуючага складу і структуры Узброеных сіл і на якаснае развіццё за кошт, перш за ўсё, пераўзбраення, мадэрнізацыі, тэхнічнага складніку.

Штатная колькасць Узброеных Сіл застаецца ранейшая — 65 тысяч чалавек. Самы фінансава затратны пункт канцэпцыі — мадэрнізацыя і закупка новага ўзбраення, ваеннай тэхнікі. Яшчэ адзін кірунак — пазбаўленне ад лішніх матэрыяльных сродкаў і тэхнікі, якая здымаецца з ўзбраення.

Што датычыцца прыярытэтаў, то ў першую чаргу фінансавацца будуць мерапрыемствы, звязаныя з беспілотнай авіяцыяй, з сіламі і сродкамі радыёэлектроннай і радыёлакацыйнай разведкі. Будуць удасканальвацца дальнабойныя сродкі — ударная авіяцыя, ракетныя войскі і артылерыя. Да першачарговых аднесена і пытанне закупкі боепрыпасаў, у першую чаргу зенітных кіраваных ракет і супрацьтанкавых кіраваных ракет, а таксама іншых высокадакладных боепрыпасаў.

Прынцыповае адрозненне новага плана абароны краіны ад папярэдніх у тым, што акцэнт у ім робіцца на прадухіленне развязвання агрэсіі і на стратэгічнае стрымліванне.

«Удзелена больш увагі пытанням прадухілення дэстабілізацыі ўнутранай сітуацыі ў краіне. Такія сучасныя рэаліі, з якімі сутыкаецца ўвесь свет. З гэтага пачынаецца — з правакавання ўнутранага канфлікту. Зразумела, што ў супрацьстаянні гэтаму павінны быць задзейнічаныя не толькі Узброеныя Сілы, ваенная арганізацыя дзяржавы, але і ў цэлым уся краіна», — каментаваў абноўлены план абароны Беларусі тагачасны Дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Станіслаў Зась.

Асаблівасць плана абароны краіны на наступныя пяць гадоў таксама ў тым, што ён, па словах тагачаснага міністра абароны Андрэя Раўкова, па ўсіх кірунках прыземлены.

Пры распрацоўцы новага плана абароны ўлічваўся вопыт Сірыі, Украіны, Балівіі, Венесуэлы і іншых краін, якія сутыкнуліся з пагрозай для свайго суверэнітэту і тэрытарыяльнай цэласнасці.

У Беларусі ёсць роты хуткага рэагавання, якія знаходзяцца ў 90-хвіліннай гатоўнасці, каб абараніць любы ўчастак граніцы або любы стратэгічна важны аб'ект.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Чвэрць стагоддзя 25

Армія — гэта адзін з абавязковых складнікаў любой дзяржавы. Сучасныя Узброеныя Сілы Беларусі выбудоўваюцца паводле новай Ваеннай дактрыны, прынятай асобным законам у 2016 годзе. Яна па-ранейшаму носіць выключна абарончы характар. У дакуменце ўлічана мноства фактараў. Але ўсе яны датычацца патэнцыйнай знешняй пагрозы.

— Па-першае, на момант прыняцця дактрыны ўпершыню за пасляваенны час баявыя дзеянні вяліся ў суседняй дзяржаве, за некалькі соцень кіламетраў ад нашых граніц, — растлумачылі ў Міністэрстве абароны. — Асаблівасцю ж сучасных ваенных канфліктаў з'яўляюцца змешаныя спосабы вядзення баявых дзеянняў. Пры гэтым падчас іх выкарыстоўваюцца як высокаэфектыўныя сістэмы звышдакладнай зброі, так і нерэгулярныя ўзброеныя фарміраванні. Па-другое, адзначаўся рост мілітарызацыі Усходняй Еўропы. Па-трэцяе, назіралася імклівае прагрэсаванне міжнароднага тэрарызму.

Ваенная дактрына Беларусі таксама канстатуе, што некаторыя дзяржавы і тэрарыстычныя групоўкі актыўна выкарыстоўваюць механізмы змены дзяржаўнага ладу ў іншых краінах і правакуюць парушэнне тэрытарыяльнай цэласнасці шляхам узброенага канфлікту.

— Усё гэта і вызначыла галоўную мэту будаўніцтва і развіцця айчынных Узброеных Сіл — стварыць кампактную, мабільную, добра падрыхтаваную і высокааснашчаную армію, здольную процідзейнічаць новым выклікам і пагрозам, у тым ліку так званым «гібрыдным войнам». Прыярытэтнымі кірункамі вызначаны далейшае развіццё сістэм кіравання, разведкі, інфармацыйнага супрацьстаяння, радыёэлектроннай барацьбы, проціпаветранай абароны, сіл спецыяльных аперацый, ракетных войскаў. Пры гэтым праходзіць аптымізацыя баявога і агульнага складу пры захаванні кадравага патэнцыялу, а войскі актыўна пераўзбройваюцца. Ідзе імклівая мадэрнізацыя тэхнікі — так, па стане на 2018 год удзельная вага сучасных яе ўзораў дасягнула ўжо 40 %.

Навінкі ўзбраенняў і вайсковай тэхнікі, распрацаваныя прадпрыемствамі Дзяржкамваенпрама, можна пабачыць на выстаўцы Milex, якая праходзіць раз на два гады ў Мінску. Апошняя выстаўка на цяперашні момант прайшла летась.

Апавядаць пра тое, як змяніўся за апошнюю чвэрць стагоддзя кожны від і род войскаў, можна вельмі доўга. Але ліміт газетных палос не бясконцы. Таму мы вырашылі сёння спыніцца на двух з іх, якія атрымалі найбольш імклівае развіццё ў сучаснай Беларусі. Гэта беспілотная авіяцыя, створаная фактычна з нуля пасля працяглай паўзы, і войскі сувязі, на якія кладзецца велізарная задача па забеспячэнні ўстойлівага кантакту паміж злучэннямі і камандаваннем.

Узровень

АД «АНАЛАГА» ДА «ЛІЧБЫ»

У незалежнай жа Беларусі сувязь прайшла за чвэрць стагоддзя проста каласальную эвалюцыю. З гэтым сутыкаецца кожны з нас. Так, калі 25 гадоў таму мабільны тэлефон выглядаў экзотыкай, пазваніць на іншы мацярык каштавала істотных грошай, а эфір міжнародных радыёдыяпазонаў (кароткіх і сярэдніх хваль) проста ламіўся ад колькасці самых разнастайных станцый з рознай якасцю прыёму, то цяпер баль правіць «лічба», а доступ да яе пастаянна забяспечвае невялікі смартфон. Але як жа пераход да сучаснага фармату адбыўся ў ваенных? Пра гэта «Звяздзе» расказаў **начальнік сувязі Узброеных Сіл Алег МІШЧАНКА.**

У спадчыну ад магутнай савецкай Беларускай ваеннай акругі нам дасталася адносна развітая і сучасная структура сувязі. Але з'яўляліся новыя сродкі і спосабы вядзення ўзброенай барацьбы, пры гэтым знешняе аблічча і задачы Узброеных Сіл Беларусі змяняліся. Ды і эканамічная сітуацыя ў 1990-я была, як вядома, не з самых лепшых. Як вынік — у канцы мінулага тысячагоддзя наша ваенная сувязь ужо была састарэлая і не ў поўнай ступені адпавядала выклікам і рэаліям. Яе ўдалося мадэрнізаваць за тры этапы.

— Пытанне датычылася менавіта тэхнічнага складніку, — адзначае Алег Мішчанка. — Савецкія апараты былі састарэлыя маральна — з натуральных прычын яны не маглі працаваць у лічбавым фармаце. Аналагавыя сістэмы былі вельмі грувасткія, яны патрабавалі вялікай колькасці тэхнічных адзінак і асабовага складу. Неабходнасць пераўтварэнняў наспела. З іншага боку, асноўныя высілкі былі скіраваны на тое, каб утрымаць існуючую сістэму сувязі ў гатоўнасці да баявога выкарыстання. Пры гэтым — не дапусціць крытычнага зніжэння і забяспечыць кіраванне Узброенымі Сіламі. Быў праведзены поўны аўдыт сістэмы сувязі, які вызначыў далейшыя кірункі развіцця, і прынята рашэнне распрацаваць і ўкараніць сродкі радыё, радыёрэлейнай, спадарожнікавай, трапасфернай і дротавай сувязяў, якія адпавядалі на той час самым сучасным патрабаванням.

Другі этап развіцця сістэмы сувязі беларускага войска пачаўся ў сярэдзіне 2000-х. Стала зразумела, у якім кірунку трэба рухацца. Але тут жа ўзнікла дылема: як лепш зрабіць? Выбар стаяў паміж імпартам тэхнікі і сродкаў сувязі з-за мяжы і распрацоўкай сваіх узораў. На карысць першага варыянта было тое, што гэта самы просты і хуткі варыянт аснашчэння патрэбнымі апаратамі. Ды вось толькі тут хавалася шмат падводных камянёў, напрыклад, тэхналагічная залежнасць і абмежаваныя магчымасці па абслугоўванні і рамонце. Як вынік — наша ваенная сувязь аўтаматычна ставілася б у інфармацыйную залежнасць ад вытворцы.

— Менавіта таму мы прынялі рашэнне ствараць лінейку сродкаў сувязі самастойна, але арыентуючыся пры гэтым на самыя сучасныя распрацоўкі ў свеце, — заўважае Алег Мішчанка. — Упраўленне сувязі Генеральнага штаба шчыльна працавала ў гэтым кірунку з навукова-даследчымі інстытутамі, Міністэрствам сувязі і інфарматызацыі, спецыялістамі Ваеннай акадэміі, Беларускай дзяржаўнай акадэміі сувязі, а таксама прадпрыемствамі Дзяржкамваенпрама.

Сумесна спецыялісты правялі цэлы масіў навукова-даследчых і даследна-канструктарскіх работ. Іх вынікам стала тое, што адзін за другім пачалі з'яўляцца новыя сродкі і комплексы сувязі — мабільны вузел сувязі «Мускат», лічбавыя радыёрэлейныя станцыі «Цытрус» і «Ярус», шматмэтавая і шматдыяпазонная станцыя «Рапсодыя». За гэтымі назвамі хаваюцца комплексы, якія ні ў чым не саступаюць сусветным аналагам. Да таго ж перад намі стаялі яшчэ дзве задачы — скараціць тэрміны выканання работ і сэканоміць бюджэтныя сродкі. Таму там, дзе можна было мадэрнізаваць тэхніку, мы гэта зрабілі. Так былі абноўлены радыёстанцыя «Карвет», радыёрэлейная станцыя «Сасна», комплексная апаратная сувязь «Компас». Дапамагла і напрацаваная ў савецкі час у Беларусі выдатная база, якая датычылася грамадзянскай радыёэлектронікі.

Трэці этап развіцця сістэмы сувязі праходзіць у нашы дні. Цяпер асноўныя намаганні сканцэнтраваны па двух кірунках. Гэта як распрацоўка і стварэнне сродкаў і комплексаў сувязі для тактычнага ўзроўню кіравання, так і пашырэнне магчымасцяў і прапускной здольнасці апорнай сеткі сувязі ў цэлым. Сучасная перадача як даных, так і маўлення павінна адбывацца аўтаматызавана, бесперапынна, устойліва і схавана. А каналаў сувязі трэба выкарыстоўваць некалькі — радыё, спадарожнік і «дрот».

— Перад намі стаяла задача распрацаваць і наладзіць вытворчасць усёй лінейкі неабходных сродкаў сувязі, якія б адпавядалі агучаным вышэй патрабаванням. І нам гэта ўдалося, — лічыць Алег Мішчанка. — Так з'явіліся комплексная апаратная сувязі «Кайман-КАС», камандна-штабная машына «Эпоха», камбінаваная радыёстанцыя «Асілак-2». Наш асаблівы гонар — гэта станцыя спадарожнікавай сувязі «Усход», лічбавая радыёрэлейная станцыя «Сасна-2» і станцыя трапасферная сувязі «Гарызонт». Яны кардынальна пераўзыходзяць па сваіх магчымасцях апараты старога парка і куды больш мабільныя.

— Найлепшы сродак «абкатаць» тэхніку ў баі — гэта вучэнне, дзе абстаноўка максімальна набліжана да рэальнай баявой. Што ўдалося паказаць сувязістам падчас вучэнняў «Шчыт Саюза — 2019»?

— Наша сувязь была выбудавана падчас іх выключна на новых і мадэрнізаваных узорах. 30 % тэхнікі, якая ўдзельнічала ў вучэннях, было прынята на ўзбраенне ў 2019 годзе. І адразу ж — у праверку боем. Усе ўзоры выпрабаванні вытрымалі. Асобна хачу спыніцца на лёгкабраніраваных аўтамабілях павышанай праходнасці, якія забяспечвалі кіраванне войскамі вышэйшаму каманднаму складу. Іх мы паказалі сёлета на парадзе да Дня Перамогі. Гэтыя аўтамабілі маглі перадаваць даныя не толькі па стандартных каналах сувязі, але і праз спадарожнікі — як наш, так і расійскі.

А што да развіцця музея «Замкавы комплекс «Мір», які, відавочна, з'яўляецца сапраўднай нацыянальнай, агульнадзяржаўнай каштоўнасцю нашай краіны, то ў час круглага стала быў выкладзены цэлы спектр слушных прапаноў. Наперадзе ў музейшчыкаў — рэканструкцыя вадаскіднага збудавання з добраўпарадкаваннем і арганізацыяй пляцоўкі для сезоннага гандлю; рэстаўрацыя і прыстасаванне флігеля; арганізацыя рэгулярнага парку (так званага «італьянскага саду»). Пра гэтыя ды іншыя клопаты музейна-замкавага жыцця гаварылі на круглым стале і Аляксандр Лойка, і кандыдат гістарычных навук Вольга Папко, і загадчык аддзела генеалогіі, геральдыкі і нумізматыкі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Аляксей Шаланда. Усе яны так ці іначай закраналі і кніжную, кнігазнаўчую тэму. Дарэчы, і на круглым стале, і ў кулуарах фестывалю прагучала шмат розных ініцыятыў, якія, несумненна, разам і сфарміруюць парадак дня для прапаганды асветніцкай кнігі ў нашым грамадстве.



Асобна на фестывалі быў прэзентаваны праект «У пошуках страчанага», з якім на Дзяржаўную прэмію Рэспублікі Беларусь намінаваны збіральнік старых паштовак Уладзімір Ліхадзедаў. Дарэчы, мясцовай школе і Мірскай гарпасялковай бібліятэцы ён падарыў асобнікі сваіх філакартычных альбомаў з рэпрадукцыямі старых паштовак. Бібліятэчкі кніг — і школе, і мясцовай бібліятэцы — падарыла і Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Гэта ўжо стала добрай традыцыяй — пакідаць пасля завяршэння «Кніжных сустрэч у Мірскім замку» ў падарунак кнігі.

Мікола БЕРЛЕЖ.

Г. п. Мір, Карэліцкі раён.

Фота Уладзіслава ЦЫДЗІКА.

Ініцыятыва

Білборды з партрэтамі таленавітай моладзі

У Гомелі размешчана сем білбордаў з выявамі маладых людзей, якія дамагліся значных поспехаў і вядомыя ў рэгіёне, краіне і свеце.



Такія партрэты можна сустрэць у розных месцах абласнога цэнтра. На іх адлюстраваны гамяльчане, якія паказалі высокія вынікі ў спорце і іншых галінах. Імёны некаторых з іх на слыху ў многіх беларусаў.

Напрыклад, на адным са шчытоў — майстар спорту міжнароднага класа па сучасным пяцібор'і, чэмпіёнка свету Вольга Сілкіна. На другім — майстар спорту Беларусі па акадэмічным веславанні, сярэбраны прызёр чэмпіянату Еўропы сярод моладзі Андрэй Федарэнка. Аляксей Зайцаў і Ілья Галавач апынуліся на маштабным фота дзякуючы перамозе ў рэспубліканскім маладзёжным праекце «100 ідэй для Беларусі». Праслаўляюць Гомель і выявы землякоў: «Чалавек года» Гомельскай вобласці, пераможца спаборніцтва «Самы моцны гамяльчанін» Іван Дусянок, майстар спорту міжнароднага класа па акрабатыцы, чэмпіён II Еўрапейскіх гульняў Артур Белякоў, камандзір і камісар першага ў краіне студэнцкага атрада матросаў-выратавальнікаў Руслан Грабко і Станіслаў Сядых, чэмпіёнка свету па пажарна-выратавальным спорце Паліна Кушнярэнка.

Тэматычныя білборды, якія ўпрыгожылі вуліцы абласнога цэнтра, створаны ў рамках праекта Гомельскай гарадской арганізацыі БРСМ пад агульнай назвай «Разам».

— Мы ганарымся сваім горадам, сваёй моладдзю, — кажа **другі сакратар Гомельскага гаркама БРСМ Валерыя МІЛАВАНАВА**. — Безумоўна, маладыя, адухоўленыя абліччы хлопцаў і дзяўчат, якія дасягнулі значных поспехаў у сваім жыцці, выклікаюць добрыя эмоцыі, павагу. Хочацца спадзявацца, што кагосьці з маладога пакалення яны натхняць на заняткі спортам, на дасягненне сваіх мэт у іншых сферах.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

ЯГАДЫ, ЦЭНЫ, МАСКІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Клубніцы трымаюць цвёрды адрэзак цэн ад трох з паловай да чатырох рублёў. Варта сказаць, што ягады мала чым адрозніваюцца на першы погляд, і за тры з паловай можна купіць такія ж спелыя, прыгожыя, чыстыя, як і за чатыры. Відаць, той, што прывёз шмат і хоча прадаць хутчэй, крыху зніжае кошт. Бяруць у асноўным па кілаграме, але ёсць гаспадыні, якія прыходзяць з вёдрамі. Значыць, будуць гатаваць варэнне альбо замарожваць свежую ягаду.

Валянціна Пятроўна, уся абкладзеная скрынямі і латкамі клубніц, кажа, што вырасціла ягады ў Брэсцкім раёне. Пакуль адпускае тавар, ахвотна дае парады, як лепей яго захоўваць: «Ні ў якім разе нельга мыць пасля таго, як прынясеш з кірмашу. Трэба пакласці яе ў кантэйнеры альбо міскі і паставіць у халадзільнік. Пры гэтым лепш выбіраць не самую халодную паліцу. А мыць — перад ужываннем: так ягады будуць захоўвацца некалькі дзён. Гэтаксама захоўваць і маліны, калі яна з'явіцца».

Шмат памідораў вырошчваюць цяплічнікі пад Брэстам. Таму выбар ёсць. Звычайныя гандляры агароднінай, якія бяруць яе на аптовых базах, як заўсёды, прапаноўваюць замежныя таматы, а таксама прадукцыю прадпрыемства «Бярэсце». А побач гандлююць ужо з дамашніх цяпліц. Дзяўчынка-падлетак, якая праводзіць канікулы з карысцю для сям'і, завіхаецца каля прылаўка. Яна хутка накладвае памідоры, расказвае, чым адрозніваюцца чырвоныя ад жоўтых. У яе яны каштуюць аднолькава — па 4,50 рубля. Працуе школьніца ў масцы, пальчатках, як і належыць. Адборныя маленькія агурочкі ў юнай гандлярцы — па 2,80 рубля. Можна знайсці агуркі і крыху танней, але фактар прадаўца адыгрывае сваю ролю, і мы купляем менавіта ў яе.

Побач прадаюць свежыя буракі (2,50), рэпчатую цыбулю (1,80), маладыя кабачкі (3,00), капусту па рублі, зялёную цыбулю — па 10 рублёў за кілаграм. Значыць, надышоў той час, калі свежая прадукцыя цалкам адцясніла леташнюю. Ураджай мінулага года са стабілізацыйных фондаў прадаюць хіба толькі супермаркеты.

На крайнім прылаўку гэтага рынку традыцыйна размяшчаюцца гандляры дарамі лесу. З чарніцамі была заўважаная адна жанчына. Літровы слоік ягадаў яна аддавала за 10 рублёў, паўлітровы — за пяць. Побач мужчына прапаноўваў гранёную шклянку суніц за 4 рублі, у два разы большы пластыкавы кубачак каштаваў 8 рублёў. Такі ж кубачак лісічак малады вясёлы грыбнік аддаваў за 5 рублёў.

Фота Валерыя КАРАПЯ.

Шклянку агрэсту прапаноўвалі за 2,50. А чарэшні, якія гаспадар вырасціў, паводле яго слоў, у Камяніцы Журавецкай (прыгарад Брэста. — **Аўт.**), ён аддаваў па 10 рублёў за кіло. І ў яго скрыні былі толькі рэшткі. Вось так дастаткова прайсці па рыначных радах, і можна зрабіць выснову, што на поўдзень краіны канчаткова прыйшло лета.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ПАДОРЫМ ДЗЕЦЯМ РАДАСЦЬ!

Італьянскі казачнік Джані Радары, якога шануюць дзеці ўсіх краін, пакінуў нам мудрую падказку: «Няма на свеце чалавека, шчаслівейшага за таго, хто можа падарыць што-небудзь дзецям».

Старэйшыя мае сябры, настаўнікі, пісьменнікі Іван Шамякін, Васіль Вітка, Анатоль Грачанікаў даверылі мне беларускі часопіс «Вясёлка» сорак адзін год таму. За гэты час падпісана ў свет 492 нумары дзіцячага часопіса. 492 мастацкія кніжачкі ўвайшлі ў сем'і, дзе гадуюцца дзеці. А калі скласці гэтыя кніжачкі ў адну, то атрымаецца зборнік дзіцячай літаратуры ў 11 808 старонак. У ім — усе колеры дзіцячага чытва: казкі, апавяданні, вершы, паэмы, загадкі, смяшынкі, вандроўныя нататкі...

Мне часта даводзіцца выступаць у дзіцячых аўдыторыях, у вялізных залах, класах, бібліятэчных пакоях. І кожны раз чую ад сваіх юных сяброў прызнанне: «Мая бабуля выпісвала «Вясёлку», «А мая мама захоўвае «Вясёлку», якую чытала ў маленстве». Сапраўды, наш часопіс нельга прачытаць і потым здаць у макулатуру. Мы дорым творы мастацкія, якія могуць крануць душу і сэрца маленькага, але вельмі патрабавальнага чытача. Вось чаму ў рэдакцыі для ўсіх пакаленняў супрацоўнікаў існуе адно нязменнае правіла: трэба пазіраць не ў твар аўтара, а ў яго твор. Дарэчы, за год мы друкуем на старонках «Вясёлкі» да ста беларускіх аўтараў. Найлепшыя з найлепшых уганароўваюцца прэміяй Васіля Віткі, медалём з выявай заснавальніка часопіса і дыпломам. Дарэчы, вось ужо больш за дзесяць гадоў я ўручаю прэмію галоўнага рэдактара юным аўтарам. Вырошчваем спадчыннікаў беларускай літаратуры!

За апошні час мы прапанавалі сваім чытачам вельмі цікавыя вандроўкі па Беларусі пад назвай «Я тут жыву». Пабывалі з імі на БелАЗе, праплылі па Нёмане, Прыпяці, Дняпры, наведалі Белавежскую пушчу, Нарач, гарады і вёскі, дзе нарадзіліся вядомыя дзіцячыя пісьменнікі, праехалі Беларускай чыгункай па ўсіх станцыях. Мастакі стварылі ўнікальныя карты нашай Айчыны, усіх шасці абласцей і сталіцы — Мінска. (Хутка ўвесь гэты вясёлкаўскі здабытак выйдзе асобнай кнігай «Я тут жыву» ў найбуйнейшым педагагічным выдавецтве Беларусі «Адукацыя і выхаванне».)

А ёсць жа яшчэ «Тэатр Васі Вясёлкіна», які прапануе не толькі прачытаць кароткую п'еску, але і разыграць яе на сцэне, у класе. Ёсць «Спеўнік «Вясёлкі» з нотамі ды «Смяшынкі-весялінкі», якія не толькі павесяляць, а і прымусяць задумацца. Апроч таго, шырока раскрыты старонкі часопіса для юных мастакоў. У кожным нумары мы адкрываем новыя таленты, якія некалі, веру, папоўняць кагорту беларускіх жывапісцаў.

Уся гэтая вялізная праца для чытачоў дае нам права спадзявацца на тое, што надыдзе час, калі паштальёны будуць насіць «Вясёлку» ва ўсе сем'і, дзе жывуць, гадуюцца дзеці. Давайце падорым ім «Вясёлку» і станем тымі шчаслівымі «чалавекамі», пра якіх казаў мудры казачнік Джані Радары.

І яшчэ некалькі слоў пра наш новы часопіс «Буся». Мы стварылі яго некалькі гадоў таму для дашкольнікаў. Да гэтага чатырыста тысяч дзетсадаўцаў не мелі свайго выдання. Вось мы, вясёлкаўцы, і вырашылі зрабіць ім падарунак. Цяпер марым пра тую залатую пару, калі ўсе чатырыста тысяч выхаванцаў дзіцячых садкоў стануць сябрамі «Бусі».

Уладзімір ЛІПСКІ,
галоўны рэдактар часопісаў «Вясёлка», «Буся».

ПАМЯЦЬ — СВЯШЧЭННАЯ

У дзень усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны ў Полацку адкрылі мемарыяльны комплекс «Урочышча «Пяскі»

Каб нарэшце быў пахаваны з гонарам апошні салдат і скончылася для Беларусі тая вайна, беларусы ўсёй грамадой дапамагалі стварэнню мемарыяла на месцы перасыльнага лагера для савецкіх ваеннапалонных «Дулаг-125». Далучылася да праекта і «Звязда».

У дату пачатку апошняй вайны жыхары і госці Полацка праз 79 гадоў зноў згадалі пра жах, боль і адчай, перанесеныя людзьмі, што загінулі ад рук катаў. Не хопіць усіх слёз свету, каб аплакаць іх. Смутак, які не мае тэрміну даўніны, і сёння трывожыць нашыя сэрцы...

Першы намеснік старшыні Полацкага райвыканкама Сяргей ЛЕЙЧАНКА нагадаў, што беларусы першыя з народаў Савецкага Саюза прынялі на сябе ўдар нямецкай армады. За родную зямлю да апошняй кроплі крыві змагаліся стары і малы.

«Бесчалавечная машына фашызму знішчала не толькі салдат — ахвярамі сталі мільёны мірных людзей. Урочышча «Пяскі» — велізарная брацкая магіла, дзе спачываюць рэшткі дзясяткаў тысяч ваеннапалонных і цывільнага насельніцтва, змучаных, скатаваных і забітых нацыстамі. Мы схіляемся перад нявіннымі ахвярамі, памяць аб іх — свяшчэнная. Мемарыяльны комплекс стаў сімвалам і данінай гэтай памяці», — сказаў Сяргей Лейчанка.

Па яго словах, сёння беларусы асабліва ўсведамляюць неабходнасць нацыянальнага адзінства, а любоў да сваёй Радзімы — гэта сіла, якую не ў стане знішчыць ні варожая моц, ні халодны разлік, ні злая воля. Наш народ ніколі не забудзе пра злачынствы нацызму і не дапусціць паўтарэння падобнага, перакананы першы намеснік старшыні Полацкага райвыканкама.

Першы намеснік старшыні праўлення Беларускага фонду міру Аляксандр ЧЫРКО паведаміў, што работа над мемарыялам пад кіраўніцтвам Полацкага райвыканкама завершана праз дзесяць гадоў дзякуючы валанцёрам, ваенным і ўсім людзям з вялікім сэрцам.

«Вам за гэта нізкі паклон. І дай бог, каб на нашай зямлі больш не было вайны», — пажадаў Аляксандр Чырко.

У дзень усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны ў мемарыяльным комплексе «Урочышча «Пяскі» прайшла Вахта памяці. Прадстаўнікі мясцовай і рэспубліканскай улады, рэлігійных канфесій і грамадскіх аб'яднанняў, ваеннаслужачыя Полацкага гарнізона, кадэты, навучэнцы і, вядома, мясцовыя жыхары, якія захоўваюць памяць пра загінулых, усклалі да мемарыяла кветкі ў знак вечнай падзякі і пашаны.

Варвара МАРОЗАВА.

Фота БелТА.

ЧС-2021

КАБ КАНКУРЭНЦЫЯ БЫЛА МАЦНЕЙШАЯ

Кангрэс Міжнароднай федэрацыі хакея зацвердзіў перанос тэрмінаў правядзення чэмпіянату свету 2021 года, які пройдзе ў Беларусі і Латвіі

Турнір адбудзецца з 21 мая да 6 чэрвеня. Гэтае рашэнне было аргументавана неабходнасцю прыстасавацца да больш позняга старту ліг у Еўропе і Паўночнай Амерыцы. Нагадаем, ранейшыя тэрміны чэмпіянату былі намечаны з 7 да 23 мая.

«Мы перанеслі чэмпіянат свету на пазнейшыя тэрміны па настойлівай просьбе нацыянальных ліг, асабліва еўрапейскіх. Нас прасілі пачаць як мага пазней. Хацелася даць магчымасць гульцам з НХЛ паўдзельнічаць у чэмпіянаце свету — гэта асабліва важна для зборных Канады і ЗША, — адзначыў прэзідэнт Міжнароднай федэрацыі хакея Рэнэ Фазель. — Цяпер усё ідзе да таго, што ў НХЛ рэгулярны сезон пачнецца нашмат пазней, чым звычайна. Магчыма, ён скончыцца толькі ў пачатку мая. Перанос дат чэмпіянату свету на пазнейшыя тэрміны дае зборным больш прасторы для прыцягнення хакеістаў з НХЛ».

Расклад матчаў і інфармацыя аб продажы білетаў будзе апублікавана пазней. У Мінску свае матчы правядуць каманды групы А — Расія, Швецыя, Чэхія, Швейцарыя, Славакія, Данія, Беларусь і Вялікабрытанія. Удзельнікі групы В — Канада, Фінляндыя, ЗША, Германія, Латвія, Нарвегія, Італія, Казахстан — згуляюць у Рызе. Фінал чэмпіянату свету адбудзецца 6 чэрвеня на «Мінск-Арэне».

Нагадаем, планетарнае першынство 2020 года, якое павінна было прайсці ў маі ў Швейцарыі, было адменена з-за пандэміі каранавіруса.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

Здарэнні

Пенсіянера шукалі больш за суткі

Мужчыну знайшлі ратавальнікі

22 чэрвеня ў 8.51 ратавальнікам паступіла паведамленне пра тое, што неабходна дапамога ў пошуку чалавека каля вёскі Коркі Мядзельскага раёна. Да месца пошукаў выехалі падраздзяленні МНС, у тым ліку пошукава-выратавальная група Рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння МНС.

У ходзе высвятлення абставін здарэння было ўстаноўлена, што 21 чэрвеня каля 12.00 пенсіянер, які жыве ў Корках, пайшоў з дому ў лясны масіў і яго месцазнаходжанне невядома.

У пошукавай аперацыі было задзейнічана каля 40 чалавек: ратавальнікі МНС (Рэспубліканскі атрад спецыяльнага прызначэння, абласны атрад і раённае падраздзяленне), работнікі раённага аддзела ўнутраных спраў і мясцовае насельніцтва. Пошукі вяліся як на зямлі, так і з паветра пры дапамозе квадракоптара.

23 чэрвеня ў 11.20 зводнай групай у полі каля вёскі Хоневічы мужчына быў знойдзены ў знясіленым стане. Ратавальнікі на квадрацыкле даставілі пенсіянера ў штаб пошукава-выратавальных работ, адкуль перадалі медыкам для далейшай шпіталізацыі.

Адзін з мясцовых жыхароў паказаў, што напярэдадні каля 10 гадзін раніцы на палявой дарозе паблізу Хоневіч ён сустрэў пенсіянера. Дадзеная інфармацыя дазволіла істотна звузіць сектар для далейшага пошуку, паведамляе падрабязнасці МНС. Гэты ўчастак быў прачэсаны пешымі групамі па чатыры чалавекі і кіналагічнай службай, а на двух квадрацыклах праверылі лясныя дарогі. Неўзабаве былі выяўлены сляды заходу ў поле, а пазней — і сам пенсіянер. У выніку за час ратавальнай аперацыі пошукава-выратавальнай групай было пройдзена каля 50 кіламетраў у лясным масіве і па палявых дарогах як у пешым парадку, так і з выкарыстаннем квадрацыклаў.

Дзіця кінула цацку ў вогнішча і атрымала апёкі

Ранкам ратавальнікам паступіла паведамленне пра тое, што ў прыёмны пакой Ельскай раённай бальніцы паступіла дзіця з апёкамі.

Па папярэдніх звестках МНС, падзеі разгортваліся наступным чынам. Маці малога, якая знаходзіцца з трыма дзецьмі ў дэкрэтным водпуску, займалася гаспадарчымі работамі, муж у гэты час быў на рабоце. Каля 18 гадзін вечара напярэдадні здарэння жанчына распаліла вогнішча ў металічным дыску, што знаходзіцца ў дварэ домаўладання, і зайшла ў жытло.

Прыблізна праз 15 хвілін малодшае дзіця вырашыла кінуць цацку з палімернага матэрыялу ў вогнішча, пры гэтым у яго загарэўся рукаў адзення. Гэта ўбачыла старэйшая сястра і пабегла ў хату, каб паведаміць пра здарэнне маці. Тая выбегла з дома і паднесла дзіця да вадзянога крана, патушыла адзенне, а пасля выклікала брыгаду хуткай дапамогі. Хлопчык шпіталізаваны з апёкамі ў цяжкім стане.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 287-18-36.

ДЛЯ ЎСІХ МАМ БЕЗ ВЫКЛЮЧЭННЯ

Інфармацыя па доглядзе дзяцей стане больш даступнай для бацькоў з інваліднасцю

У Беларусі з 18 чэрвеня стартаваў першы адукацыйны праект для бацькоў з інваліднасцю «Інклюзіўнае мацярынства». Яго мэта — зрабіць больш даступнай інфармацыю па пытаннях цяжарнасці, падрыхтоўкі да родаў, пасляродавым перыядзе і этапе догляду за нованароджаным для такіх мам і татаў. Навучальныя відэаматэрыялы былі створаны пры падтрымцы праекта MAMA PRO і размешчаны на YouTube-канале «Гід па жыцці» Беларускай асацыяцыі дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам.

Відэаролікі, у якіх эксперты даступнай мовай тлумачаць пытанні, што хвалююць усіх бацькоў, і развейваюць самыя распаўсюджаныя страхі, цяпер суправаджаюцца субцітрамі — для найлепшага ўспрымання. Акрамя таго, больш за 300 тэкставых матэрыялаў на тэму мацярынства стануць даступнымі шырокаму колу бацькоў. Наступны этап — пераклад інфармацыі на даходлівую мову, асаблівую спрошчаную версію, распрацаваную для аблягчэння ўспрымання інфармацыі людзьмі з інтэлектуальнымі парушэннямі.

Ініцыятары спадзяюцца, што гэты праект аблегчыць доступ да карыснай інфармацыі як будучым бацькам, так і маладым матулям і татам з інваліднасцю. Бо ў пытаннях цяжарнасці і родаў людзі з асаблівымі патрэбамі нярэдка сутыкаюцца з дыскрымінацыяй сваіх правоў.

— Часам жанчыны з асаблівасцямі сутыкаюцца з крытычнымі заўвагамі на этапах да і пасля цяжарнасці, часам іх і ўвогуле адгаворваюць станавіцца матулямі. Неабходнай інфармацыі не хапае, але ж жаданае мацярынства — законнае права любой жанчыны, — лічыць **эргатэрапеўт, менеджар праектаў «Гід па жыцці» Ірына КУКСІК.**

Стварэнне інклюзіўнай серыі відэаматэрыялаў — гэта першы крок на шляху да асэнсаванага бацькоўства.

— Цяжарнасць, роды і мацярынства — асаблівы перыяд у жыцці кожнай жанчыны. Праект MAMA PRO ўжо цягам некалькіх гадоў дапамагае мамам атрымаць інфармацыю па пытаннях жаночага і дзіцячага здароўя, якой можна верыць і не трэба правяраць. Для нас важна, каб доступ да гэтай інфармацыі быў адкрыты для ўсіх мам без выключэння, кажа **ўрач акушэр-гінеколаг і кіраўнік праекта MAMA PRO Дзіяна МАРДАС.**

«Інклюзіўнае мацярынства» — гэта сумесны праект сацыяльна-дабрачыннай установы па пытаннях грамадскага здароўя «Паблік Хэлс» і ініцыятывы «Гід па жыцці».

Не страціць здароўе, працуючы на ўласных сотках

Каб сад і агарод радавалі, даводзіцца нямала папрацаваць. Але, на жаль, у людзей пажылога ўзросту ёсць вялікая рызыка не разлічыць свае сілы, і нанесці шкоду здароўю. Як сябе паводзіць, каб радасць ад вялікага ўраджаю не была сапсавана болем у суставах, высокім ціскам і іншымі непрыемнымі наступствамі садова-агародных работ, і як дапамагчы свайму арганізму вытрымаць нагрузкі, расказала ўрач-гігіеніст, загадчык аддзялення гігіены працы Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Алена СМІРНОВА.

7dach.ru

— Перш чым прыступіць да работы, варта разагрэць суставы, таму неабходна зрабіць размінку. Павялічваць нагрузку на арганізм трэба паступова, ні ў якім разе нельга адразу, за пару выхадных, перарабіць усе справы, якія назапасіліся ў садзе і агародзе, — кажа спецыяліст. — Важна дазіраваць нагрузку. Нават маладым людзям, не кажучы пра людзей сярэдняга ўзросту і тым больш пенсіянераў, патрабуецца адаптацыя да дачных умоў.

Як меней стамляцца падчас работы ў агародзе?

Каб работа не нагадвала пра сябе болем ва ўсім целе ці асобных яго частках некалькі дзён пасля, медык раіць набыць невялікі ўслончык, каб працаваць у больш зручнай позе — на каленях ці седзячы. Працаваць лепш раніцай да 11 гадзін і ўвечары пасля 16. Па-першае, пажылым людзям патрабуецца адпачынак, каб аднавіць сілы. Па-другое, у пік сонечнай актыўнасці лепш паберагчыся.

Экіпіравацца пажадана ў кашулю з доўгімі рукавамі і штаны. Яны будуць ахоўваць скуру ад ультрафіялету і пякучага пустазелля. Акрамя таго, не трэба забываць пра галаўны ўбор і сонцаахоўныя акуляры.

Важна сачыць і за станам здароўя

— Лекі, якія вы прымаеце заўсёды, асабліва ад астмы, сардэчнага прыступу, ціску, алергіі на ўкусы пчол, павінны заўсёды знаходзіцца пры вас, а не ў доме ці ў кішэнях адзення, кінутага на іншым канцы агарода, — папярэджвае ўрач.

Рэкамендуецца як мага часцей мяняць від работ. Пасля праполкі адной градкі паліце расліны ці выканайце іншую работу. Галоўнае — змяніце позу і не дайце суставам «заблакавацца» ў адным становішчы надоўга. Каб зняць напружанне, прайдзіцеся па траве басанож. Травяны дыван стымулюе рэцэптары, размешчаныя на ступнях, аднаўляючы сілы, умацоўваючы імунітэт і аздараўляючы ўвесь арганізм.

Памятайце, што час ад часу варта адрывацца ад свайго занятку, каб зняць напружанне мышцаў, якія працуюць, і задзейнічаць тыя, якія зацяклі ад бяздзеяння. Алена Смірнова раіць зрабіць некалькі простых практыкаванняў на градцы. Станьце прама, ногі пастаўце разам. Падыміцеся на дыбачках як мага вышэй і затрымайцеся ў такім становішчы на 30 секундаў. Станьце на зямлю поўнай ступнёй. Паўтарыце гэта практыкаванне 5—10 разоў. Выпрастайце спіну і 4—5 разоў нахіліце галаву ўлева і ўправа, імкнучыся вухам дакрануцца да пляча. Счапіце рукі за галавой, максімальна адвядзіце локці за спіну і пабудзьце ў такой позе 10 секундаў. Згінайце спачатку адну, а потым другую нагу папераменна ў тазасцегнавым і каленным суставах. Паўтарыце 8—10 разоў.

Шкодныя позы

Не працуйце, нахіліўшы корпус уніз са становішча стоячы. Гэта вельмі шкодная поза і для работы на градках, і для пад'ёму цяжару. Гарантаваны боль у паясніцы, а з часам — сур'ёзны паяснічны радыкуліт, ішыяс (боль у сядалішчным нерве), пашкоджанні міжпазванковых дыскаў (пратрузія, грыжа). Імавернымі павышэнне ціску і гіпертанічны крыз.

Не працуйце, седзячы на кукішках. Такое становішча небяспечнае, бо ўскладняе рух крыві, пазбаўляе тканкі руху кіслароду і пажыўных рэчываў, перагружае сэрца. З высокай імавернасцю з'явіцца боль у каленных і тазасцегнавых суставах, паясніцы, можа падняцца ціск.

Небяспечна выконваць рухі, звязаныя са скручваннем у паясніцы. Іх часам робяць, калі адкідваюць глебу шуфлем ці нешта перакладваюць убок. Такія рухі небяспечныя і садзейнічаюць пашкоджанню міжпазванковых дыскаў (пратрузіі, грыжы). Паварот з грузам неабходна рабіць усім корпусам.

— Не забывайце пра адпачынак і не імкніцеся пабіць «сусветныя рэкорды» на градках! На самай справе не вы дадатак да дачы, а яна служыць вам для адпачынку і ўмацавання здароўя. Калі вы падарвяце яго, дамагаючыся ўзорнага парадку на сваіх сотках, то які сэнс будзе ва ўсёй гэтай садова-агароднай ідыліі? Хто будзе атрымліваць асалоду, калі вы апыняцеся ў бальніцы? Выйдзіце ў сад і паляжыце пад дрэвамі на свежым паветры, палюбуйцеся кветкамі, паслухайце птушак ці прыемную музыку, шорах лісця ці проста цішыню. Няхай дача будзе ў радасць, — раіць доктар.

СВОЕЧАСОВА РАССЛАБІЦЦА

Чаму так важна навучыцца рэлаксацыі

Калі перыядычна ў вас узнікаюць трывога, унутранае напружанне, раздражняльнасць, цяжкасці з засынаннем і іншыя непрыемныя сімптомы неўратычнага характару, то вам можна параіць асвоіць тэхніку дыяфрагмавага дыхання і нервова-мышачную рэлаксацыю паводле Джэкабсана. Як гэта зрабіць, расказала Ганна МІКУЛА, урач-псіхатэрапеўт Гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Мінска.

— Пры трывозе і напружанні дыханне становіцца паверхневым і частым, арганізм не атрымлівае ў дастатковай колькасці кісларод, парушаюцца суадносіны кісларода і вуглякіслага газу, ускладняецца работа сэрца, — расказвае ўрач. — Для таго каб зрабіць дыханне больш глыбокім і размераным, неабходна фіксаваць увагу на выдыху, стараючыся максімальна яго падоўжыць. Для гэта прасцей за ўсё нешта прагаворваць услых на адным дыханні да таго моманту, пакуль не скончыцца паветра ў лёгкіх, напрыклад, лічыць. Пасля гэтага пажадана зрабіць паўзу і ўдыхнуць.

Каб зразумець, ці правільна вы ўсё робіце, звярніце ўвагу на свой жывот: падчас выдыху ён як бы ўцягваецца, а на ўдыху наадварот, раздуваецца. Таму дыяфрагмавае дыханне па-іншаму называюць «дыханнем жыватом».

— Важна выкарыстоўваць гэту тэхніку не толькі падчас трывогі, але і для яе прафілактыкі. Дыяфрагмальнае дыханне дапамагае пазбавіцца ад трывогі і спешкі, зрабіць больш размеранымі і спакойнымі думкі і рухі. А таксама на ўзроўні абмену рэчываў нармалізаваць стан вашага арганізма, — тлумачыць Ганна Мікула.

Яшчэ адна тэхніка — нервова-мышачная рэлаксацыя паводле Джэкабсана. Яна заснаваная на прынцыпе ўзаемнага ўплыву мышачнага і эмацыянальнага стану.

— Каб зняць ці не дапусціць эмацыянальнае перанапружанне, неабходна папераменна напружваць і расслабляць розныя мышцы: кісцяў рук, твару, плечавога пояса, жывата, сцёгнаў, галёнак, ступняў. Напружанне важна рабіць на выдыху, пасля чаго адбываецца расслабленне, якое па часе павінна быць у некалькі разоў даўжэйшым, чым напружанне, — расказвае ўрач.

Пры гэтым важна запамінаць адчуванні, якія з'яўляюцца ў мышцах, што папрацавалі. Гэта можа быць прыемнае цяпло, адчуванне лёгкасці ці наадварот прыемны цяжар і адчуванне паколвання.

Сігнал аб расслабленні мышцаў паступае ў кару галаўнога мозга, уцягваючы ў працэс расслабленне іншыя зоны, што ў рэшце рэшт прыводзіць да рэлаксацыі ўсяго арганізма. Чым болей мышачных груп уключана ў работу, тым больш поўнае расслабленне. Калі вы абмежаваны ў часе, неабходна ў першую чаргу аддаць увагу тым мышцам, якія маюць максімальную праекцыю ў кары галаўнога мозга. Гэта мышцы кісцяў рук і твару. Напрыклад, на выдыху сцісніце кісці рук у кулакі і трымайце іх у напружанні, пакуль не стоміцеся, пасля чаго расслабце і фіксуйце ўвагу на адчуванні расслаблення, — расказвае Ганна Мікула.

Па меры трэніроўкі фарміруецца цялесная памяць пра гэта камфортнае адчуванне і адзін успамін пра яго нават без правядзення самых практыкаванняў здольны выклікаць рэлаксацыю ўсяго арганізма.

Псіхалагічны практыкум

«ПАНДЭМІЯ ПРЫМУСІЛА НАС ПРЫЦІШЫЦЬ СВАЮ ГАНАРЛІВАСЦЬ»

А можна пераўсталяваць 2020 год, а то гэтая версія з вірусам?.. Высакосны 2020-ы сапраўды стаў «высакоснейшы» за іншыя. Пра тое, як быць і што рабіць, каб пражыць яго, захаваўшы здаровую псіхіку, мы спыталі ў кіраўніка секцыі сямейнай тэрапіі Беларускай асацыяцыі псіхатэрапеўтаў, члена Еўрапейскай асацыяцыі псіхатэрапіі (EAP), выканаўчага рэдактара часопіса «Тэорыя і практыка псіхатэрапіі» (Манрэаль, Канада), кандыдата псіхалагічных навук Наталлі АЛІФІРОВІЧ.

ПРА СВАБОДУ ВЫБАРУ І САЦЫЯЛЬНУЮ АДКАЗНАСЦЬ

— У 2020-м з-за пандэміі COVID-19 грамадства страціла ўсе звыклыя маркеры, якімі мы прывыклі «мераць» год (напрыклад, тыя ж выпускныя ў школьнікаў і студэнтаў, летні адпачынак з паездкай да мора). У апошні год змянілася многае — на самым простым, бытавым узроўні. Як гэта паўплывала на светапогляд нашага грамадства?

— Аб змене светапогляду я б пакуль не гаварыла — для гэтага прайшло недастаткова часу. Але з нашага жыцця, з жыцця ўсіх сучасных людзей знік адзін аспект, які быў велізарнай каштоўнасцю апошніх дзесяцігоддзяў. Ён называецца свабода выбару. На тым жа бытавым узроўні — магчымасць выбіраць спосаб працаваць і праводзіць вольны час, школу для дзяцей, ежу, вопратку... І, напэўна, самае цяжкае выпрабаванне, якое ў сувязі з пандэміяй перажываюць як жыхары постсавецкай прасторы, так і еўрапейцы — тое, што наша свабода выбіраць на самым простым узроўні стала вельмі абмежаванай. Мы абмежаваныя ва ўсім: у выбары вольнага часу і работы (многія прафесіі, як мы бачым, сталі незапатрабаваныя з-за таго, што людзі вымушаны абмяжоўваць свае траты), у магчымасці перамяшчэння. І, вядома, для многіх гэты крызіс, звязаны з немагчымасцю выбіраць, стаў проста татальным. Ён закрануў іх і фінансава, і маральна, і псіхалагічна. Напэўна, менавіта таму на пачатку пандэміі грамадства так раздзялілася, калі казаць пра стаўленне да каранавіруса. Тыя людзі, у якіх і раней не было асаблівай патрэбы выбіраць, не адчулі сур'ёзнага дыскамфорту. А іншыя перажывалі неабходнасць абмежаваць кантакты вельмі цяжка.

— У Беларусі каранціну не было. З пункту гледжання псіхолагаў гэта, хутчэй, добра?

— Напэўна, так. Калі казаць аб псіхалагічным аспекце сітуацыі, у нашай краіне ўсё яшчэ досыць нядрэнна, таму што ў нас не ўводзіўся каранцін. А таксама няма жорсткай сістэмы пакаранняў за парушэнне ізаляцыі. Свабода перамяшчэнняў абмяжоўваецца толькі ў тых, хто быў у кантакце з хворымі. Астатнія на працягу ўсіх гэтых месяцаў маглі свабодна перамяшчацца. У іншых краінах была яшчэ адна псіхалагічная праблема — страх пакарання за невыкананне нейкіх прадпісанняў. Успомніце, колькі парушэнняў каранціну было ў законапаслухмяных еўрапейскіх дзяржавах. Да гэтага прывяло парушэнне свабоды выбару. У беларусаў на працягу апошніх месяцаў выбар заставаўся. Не ведаю, добра гэта ці дрэнна з пункту гледжання вірусолагаў, але мы маглі вырашаць, хадзіць нам на работу або сядзець дома, вадзіць дзяцей у школу ці замыкаць іх у кватэры, мець зносіны з сябрамі афлайн або анлайн.

— А калі казаць аб сацыяльнай адказнасці...

— Адказныя паводзіны ў такой сітуацыі — гэта насіць у шматлюдных месцах і рэгулярна мяняць маскі, выконваць іншыя прадпісанні медыкаў. Але паколькі ніхто не прымушае гэта рабіць, нашы людзі часта выбіраюць гэтага не рабіць. І тут мы бачым вельмі цікавы момант, які падзяліў грамадства на дзве вялікія групы. На тых, хто выбірае абараняць сябе і іншых, і на тых, хто выбірае супрацьлеглыя паводзіны: не насіць маскі, парушаць каранцін да вынікаў аналізаў, будучы кантактам першага ўзроўню, падвяргаць небяспецы іншых. І такіх людзей шмат. Бываюць гісторыі, калі, напрыклад, выкладчык, які меў кантакт першага ўзроўню, прыходзіў на работу. І гэта чалавек з вышэйшай адукацыяй, здавалася б, адказны. Але ён, апынуўшыся ў крытычнай сітуацыі, выбраў паводзіць сябе так, як звычайна.

— Чаму?

— Тут мы сутыкаемся з такім раздзелам псіхалогіі, як копінг-стратэгіі, або стратэгіі барацьбы са стрэсам. Ёсць розныя спосабы справіцца са складанай рэальнасцю. Можна выбіраць канфрантацыю: я буду рабіць як раней, нягледзячы на каранавірус і змену эканамічных умоў. Можна дыстанцыявацца ад праблем, заняцца іншым, не думаць пра гэта, не глядзець тэлевізар. Можна выбраць самакантроль: не бываць у людных месцах без неабходнасці, выконваць рэкамендацыі медыкаў. Усё гэта мы бачым у інтэрнэце: ад груп, дзе з жахам абмяркоўваюць наступствы каранавіруса да груп «антыкаранавірус». Ёсць і такі копінг, як станоўчая пераацэнка сітуацыі — і гэта вельмі нядрэнны спосаб спраўляцца са стрэсам.

ПРА СКЛАДАЛЬНІКІ ШЧАСЦЯ І НАПРУЖАННЕ Ў СЕМ'ЯХ

— Зараз шмат выказванняў аб тым, што свет больш ніколі не будзе такі, як раней. Як вы да іх ставіцеся?

— Толькі за апошнія сто гадоў чалавецтва перажыло вялізную колькасць рэвалюцый і войнаў, распадаліся і ствараліся дзяржавы. І кожны раз людзі казалі, што свет ніколі не будзе такі, як раней. Але псіхалогія людзей не мяняецца, наша псіхіка заўсёды дзейнічае па адных і тых жа законах. Калі чалавек знаходзіцца ў адноснай стабільнасці, калі большасць яго патрэбаў задавальняецца, калі ён атрымлівае больш ці менш здавальняючыя грошы за сваю работу, такі чалавек паволі нарошчвае свой патэнцыял і паводзіць сябе, як нармальны член грамадства. Але як толькі пачынаецца павышэнне трывогі — пандэмія, эканамічны крызіс, вайна, перабудова, у многіх (асабліва калі гэта людзі з пагранічнай арганізацыяй асобы), даюць збой ахоўныя механізмы і сацыяльныя механізмы рэгулявання адносін. Такія людзі пад уздзеяннем стрэсу становяцца занадта трывожнымі, занадта напалоханымі, яны дзейнічаюць неадпаведна сітуацыі. У прыватнасці, парушаецца здольнасць да навучання новаму (людзі ў норме пры добрай матывацыі ў любым узросце могуць вучыцца новым паводзінам, атрымліваць новыя веды). У стрэсе ў многіх узнікаюць цяжкасці з апрацоўкай інфармацыі, людзі перастаюць правільна разумець эмоцыі і пачуцці іншых, страчваюць здольнасць да рэфлексіі. У выніку парушаецца здольнасць да нармальных блізкіх адносін. Паглядзіце, колькі цяпер канфліктаў у сем'ях. Па розных крыніцах, ад 20 да 40 % сем'яў адчуваюць велізарнае напружанне.

— Можа быць, людзі проста часцей сталі бываць разам?

— Справа ў тым, што павышаная трывожнасць парушае здольнасць да пабудовы блізкіх адносін, да клопату пра сваякоў, да разумення стану іншых людзей. Прывяду прыклад. Раней дзяцей бралі на сябе дзіцячыя сады, школа, летнія лагеры. Паглядзіце, што адбываецца цяпер. Колькасць захварэлых за суткі памяншаецца, але застаецца ў досыць высокіх межах штодня. І пры гэтым многія бацькі, якія стаміліся ад сваіх дзяцей, адпраўляюць іх куды заўгодна — у тыя ж летнія дзіцячыя лагеры. Ну а што, у нас зніжэнне колькасці захварэлых, ды і дзеці хварэюць лягчэй за дарослых. Яны як быццам забываюць пра тое, што гэта даволі сур'ёзная хвароба, ад якой усё яшчэ не знойдзена эфектыўнага лячэння. Дарослыя людзі, якія адказваюць за бяспеку дзяцей, выбіраюць звычайны спосаб паводзінаў у незвычайнай сітуацыі, выкарыстоўваючы нібыта разумныя аргументы, але на самай справе не вытрымліваючы напружання. Іх няздольнасць быць у блізкіх адносінах становіцца відавочнай — а гэта ўжо не сацыяльная праблема, а асабістая.

— Мне здаецца, большае напружанне, чым сітуацыя з COVID-19, выклікае эканамічная нестабільнасць...

— Так, гэта сур'ёзны фактар псіхалагічнага дыскамфорту. У сучасным свеце дастаткова толькі двух складнікаў, каб чалавек адчуваў сябе шчаслівым. Першы — эканамічная незалежнасць, другі — наяўнасць хоць бы аднаго блізкага чалавека, з якім можна падзяліцца сваімі перажываннямі. Калі вы пражываеце ў маленькім населеным пункце, але ў вас ёсць добраплатная работа (дапусцім, дыстанцыйная) і блізкі чалавек (няхай нават не побач, але з магчымасцю зносін анлайн), вы будзеце адчуваць сябе значна лепш, чым чалавек, які жыве ў сталіцы ў сваёй сям'і, але які не мае матэрыяльнай стабільнасці і адчування, што яго любяць і цэняць.

Эканамічная незалежнасць — важны складальнік шчасця. У спакойным стане чалавек адчувае ўпэўненасць у заўтрашнім дні. У сітуацыі стрэсу, калі рвуцца ўсе ніці, якія падтрымліваюць наш дабрабыт, самаацэнка людзей зніжаецца. Прычым гэта характэрна і для людзей, якія страцілі бізнес або работу, і для тых, у каго захаваўся стабільны даход. Знікае радасць жыцця, узнікае пастаянная трывога, што заўтра сям'я можа трапіць у матэрыяльны крызіс.

— Як вы думаеце, ці можна казаць аб пераацэнцы каштоўнасцяў у дачыненні да выбару прафесіі? Сёння на плаве сферы, якія забяспечваюць патрэбнасці першай неабходнасці, — ежа, дастаўка, вытворчасць і продаж фармацэўтычных прэпаратаў...

— Пакуль рана нешта прагназаваць. Наша грамадства ўсё яшчэ перажывае перыяд адаптацыі. Кожнае сацыяльнае ўзрушэнне патрабуе, каб людзі адаптаваліся і зразумелі, як дзейнічаць у новых умовах. На гэта, як правіла, патрэбна ад шасці месяцаў да года. Далей мы прыстасоўваемся і вучымся функцыянаваць у новых умовах. Але, на жаль, як паказвае практыка, на новы ўзровень выйсці атрымліваецца не ва ўсіх. Пасля распаду Савецкага Саюза, па сутнасці, «выпала» цэлае пакаленне працаздольных людзей, якія былі добра адаптаваныя да ранейшых умоў жыцця, але не здолелі пераадолець крызіс і навучыцца жыць у зменены рэальнасці. І, што цікава, якраз тады значна лепш адаптаваліся жанчыны. Ім трэба было гадаваць дзяцей, падымаць сям'ю, і не было часу думаць аб сваім прызначэнні і іншых філасофскіх пытаннях. Тое ж самае адбываецца цяпер.

АБ УРОКАХ, ЯКІЯ ВАРТА ВЫВУЧЫЦЬ

— Што, на ваш погляд, дапаможа адаптацыі ў цяперашняй сітуацыі?

— Мы жывём у свеце, дзе цэніцца прафесійная мабільнасць. На Захадзе людзі кожныя 10—15 гадоў мяняюць прафесію — альбо радыкальна, альбо нарошчваюць кампетэнцыі ў сваёй сферы. У сучасным свеце частка прафесій адмірае. Але гэта быў паступовы працэс. А сітуацыя гэтага года яго паскорыла — усё сыходзіць у анлайн: сфера продажу, сфера адукацыі і г. д. Але варта разумець, што нават у цяперашніх умовах гэта працэс не аднаго дня. Проста зараз у нас стадыя шоку: ну чаму цяпер, калі я нарадзіла дзіця / будую кватэру / толькі скончыў універсітэт / толькі пачаў зарабляць... І напярадзе яшчэ ўсе апісаныя ў псіхалогіі стадыі перажывання грамадствам стрэсу — адмаўленне, злосць, торг, дэпрэсія і прыняцце. Адразу да прыняцця прыйсці немагчыма. Але стадыя прыняцця наступіць абавязкова. Гісторыя паказвае, што людзі выжывалі ў значна больш складаных умовах — падчас страшных эпідэмій, войнаў, рэвалюцый. Мы — нашчадкі гэтых людзей, а значыць, мы ўмеем змагацца з крызіснымі сітуацыямі. Тыя, хто справіцца са стрэсам з дапамогай здаровых стратэгій пераадолення, змогуць дасягнуць поспеху. Паглядзіце: ёсць тыя, хто менавіта цяпер пачынае новы бізнес, атрымлівае новую прафесію.

І яшчэ я раіла б пастарацца не страціць пачуццё гумару. Людзі, якія захоўваюць пачуццё гумару, лягчэй перажываюць крызісныя падзеі. Таму што гэта легальны спосаб выказаць сваю агрэсію.

— Вы гаварылі аб станоўчай пераацэнцы сітуацыі як аб здаровым спосабе спраўляцца са стрэсам. У гэтай сувязі: чаму нас навучыла пандэмія і якія ўрокі мы можам вынесці з гэтай сітуацыі?

— Перш за ўсё, мы ўсвядомілі, што наша грамадства — адзіны арганізм. Ва ўмовах пандэміі наша сувязь з кожным членам грамадства становіцца больш відавочнай. Бо сёння клопат пра сябе, сваё здароўе і бяспеку — гэта клопат пра іншых. Я нашу маску, вытрымліваю сацыяльную дыстанцыю і тым самым абараняю цябе, а ты, робячы тое ж самае, абараняеш мяне.

Ну, а самае галоўнае, чаму нас вучыць цяперашняя сітуацыя — пазбавіцца ганарлівасці, перастаць быць ганарыстымі. Апошнія дзесяцігоддзі мы здаваліся сабе гаспадарамі свайго жыцця. Колькі было трэнінгаў пад лозунгам «Хочаш — дасягнеш!». Сёння стала відавочна: мы можам не ўсё. Прымаючы адказнасць або адмаўляючы яе, па сваёй волі або мімаволі, мы павінны зразумець, што мы — усяго толькі людзі і нам не ўсё падуладна. У нашы планы ўмешваюцца абставіны, лёс, Бог, калі хочаце — як бы людзі гэта ні называлі, гэта важна навучыцца прымаць. Ад нас залежыць шмат, але не ўсё — гэта важны ўрок для ўсіх нас.

І, прыняўшы гэта, напэўна, варта падумаць, што канкрэтна залежыць ад нас, і пачаць рабіць крокі ў патрэбным кірунку — спакойна і з камфортнай для сябе хуткасцю. Мая псіхалагічная практыка паказвае, што выхад ёсць з любой сітуацыі. Больш за тое, выхадаў заўсёды шмат. Проста ў стане стрэсу ў чалавека ўключаецца «тунэльны зрок» і ён іх не бачыць. Часам варта супакоіцца і аглядзецца, каб убачыць рашэнне.

Размаўляла Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Крутогорье-Петковичи» (продавец) проводит открытый аукцион

ПО ПРОДАЖЕ ЗДАНИЯ ОБЩЕЖИТИЯ

общей площадью 63 кв. м с инв. № 620/С-41941, расположенного на земельном участке площадью 0,0707 га (право постоянного пользования) с кадастровым номером 622281709101000105 по адресу: Минская область, Дзержинский район, Дзержинский с/с, д. Ферма-Гай, ул. Центральная, 29А

Начальная цена без НДС **– 20 600,00 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены – **2 060,00** бел. руб.)

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 7 (семи) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.** Аукцион состоится **30.07.2020** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **29.07.2020** до **16.00** по указанному адресу.

Тел.: 8 (017) 516-80-65, 516-80-64, 8 (029) 102-21-17

УНН 600112675

РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки»* (организатор торгов) информирует о проведении открытого аукциона по продаже объектов, находящихся в государственной собственности –

ВАГОНОВ-МУКОВОЗОВ МОДЕЛИ 17-486, принадлежащих Республиканскому дочернему сельскохозяйственному унитарному предприятию «Белоруснефть-Особино» на праве хозяйственного ведения

Дата проведения аукциона: 21 июля 2020 г. в 10.00
Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артема, 23, каб. 1.1

Предмет торгов (лот № 1): вагоны-муковозы 2 шт., инв. № 200

Характеристика предмета торгов: вагоны для муки, модель 17-486. Заводские номера № 094, № 2073. Год выпуска 1993, 1991. Количество емкостей: 4. Объем емкостей: 86 м. куб. Грузоподъемность: 52 т. Согласно актам осмотра технического состояния вагонов от 18.01.2020 г. регистрация в ИВЦ ЖА отсутствует, вагоны могут следовать до станции Гомель отдельным локомотивом как груз на своих осях в сопровождении работника вагонного депо для дальнейшего производства текущего ремонта

Начальная цена: 48 960,00 рубля (в т. ч. НДС 20 %).
Задаток: 4 896,00 рубля (в т. ч. НДС 20 %)

Местонахождение имущества: Республика Беларусь, Гомельская область, Буда-Кошелевский р-н, ст. Уза

Местонахождение организатора торгов, контакты: г. Гомель, ул. Артема, 23, тел.: 8 (0232) 32-46-47; 32-18-95, e-mail: inogomel@tut.by, auction-gino@gino.by

Извещение о проведении аукциона опубликовано 19.06.2020 г. на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и на сайте Организатора торгов gino.by

** РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки» находится в процессе реорганизации путем присоединения к РУП «Институт недвижимости и оценки». Предполагаемый срок окончания реорганизации 30 июня 2020 г.*

Республиканское унитарное Днепро-Двинское предприятие водных путей «Белводпуть» извещает о проведении повторного аукциона по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений

№ лота	Наименование объекта	Начальная цена продажи лота, бел. руб. (с НДС)	Сумма задатка, бел. руб.
1	Помещения общей площадью 118,9 кв. м (помещение магазина площадью 50,3 кв. м, помещение склада площадью 22,2 кв. м, помещение подвала площадью 46,4 кв. м), расположенные по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Коммунаров, 7а. Здание конца XIX – начала XX века включено в Государственный список историко-культурных ценностей Республики Беларусь. Цель использования: для осуществления розничной торговли, организации общественного питания, срок договора аренды 3 года, размер арендной платы в месяц – 1458,13 руб.	502,35	50,24

Срок подачи заявления на аукцион	**По 06 июля 2020 г.** в рабочие дни с 9.00 до 16.00 от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Коммунаров, 7а, каб. 6
Дата, время, место проведения аукциона	**07 июля 2020 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Коммунаров, 7а
Номер р/с для перечисления задатка	р/с BY50PJCB30124046631000000933 в ЦБУ 400 ОАО «Приорбанк», БИК PJCBBY2X, УНП 400011137 Получатель платежа: ГП «Белводпуть», Назначение платежа: задаток на участие в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 24.06.2020 г.
Условия продажи	Шаг аукционных торгов – 15 %. Подписание договора аренды с победителем аукциона – в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 05.03.2020 г.

Дополнительная информация по тел.: 8 (029) 341 15 45, 8 (0232) 50 61 43

ООО «Центр Белинвентаризация» г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1

- ✓ **Раздел и установление порядка пользования земельным участком**
- ✓ **Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения**
- ✓ **Пересчет долей в связи с изменением капитального строения**

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «Гомельский литейный завод «ЦЕНТРОЛИТ», тел. 8 (044) 544 38 37

№ лота	Наименование объекта	Начальная цена, бел. руб. с НДС	Сумма задатка, бел. руб.
1	**Капитальное строение (спальный корпус № 2) с инв. № 310/С-47777, площадью 193,0 кв. м (составные части и принадлежности:** одноэтажное кирпичное основное строение, дощатая пристройка, крыльца), расположенное по адресу: Гомельская обл., Гомельский р-н, Приборский с/с, урочище Прибор, пионерский лагерь «Мечта», по начальной цене – 30 500,00 руб. с учетом НДС. **Капитальное строение (дом для обслуживания персонала) с инв. № 310/С-47776, площадью 140,2 кв. м (составные части и принадлежности:** одноэтажное панельное основное строение, четыре теневых навеса, два крыльца, тротуарная дорожка), расположенное по адресу: Гомельская обл., Гомельский р-н, Приборский с/с, урочище Прибор, пионерский лагерь «Мечта», по начальной цене – 24 500,00 руб. с учетом НДС. Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 321085200001000073 площадью 0,2841 га	**55 000,00**	**5 500,00**

Срок подачи заявления	**По 23 июля 2020 г.** в рабочие дни с 9.00 до 16.00 от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1
Дата, время, место проведения аукциона	**24 июля 2020 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1
Номер р/с для перечисления задатка	BY71 BPSB 3012 1783 3901 0933 0000 в РД № 300 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 491323266. Получатель платежа: ООО «Центр Белинвентаризация». Назначение платежа: задаток на участие в аукционе согласно извещению в газете ***«Звязда» от 24.06.2020 г.***
Условия продажи	Объект продается в собственность. Шаг аукционных торгов – 5 %. Заключить договор купли-продажи в течение 20 (двадцати) календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона. Оплатить стоимость лота, сформированную на аукционе в течение 30 (тридцати) календарных дней с момента подписания договора купли-продажи. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона

Для участия в аукционе необходимо представить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях с ООО «Центр Белинвентаризация».
2. Заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора торгов.
3. Юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего регистрацию юридического лица; представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
4. Юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе); представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
5. Индивидуальным предпринимателям – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; представителю индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
6. Физическим лицам – представителю физического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.
